ПРОЛЕТАРЫІ УСІХ КРАІН, ЕДНАЙЦЕСЯ!

ЛІТАРАТУРА і МАСТАЦТВА

ОРГАН САЮЗА СОВЕЦКІХ ПІСЬМЕННІКАЎ БЕЛАРУСІ, КІРАЎНІЦТВА ПА СПРАВАХ МАСТАЦТВА ПРЫ СОВЕЦЕ МІНІСТРАЎ БССР, МІНІСТЭРСТВА КІНЕМАТАГРАФІІ БССР І КАМІТЭТА ПА СПРАВАХ КУЛЬТУРНА-АСВЕТНЫХ УСТАНОЎ ПРЫ СОВЕЦЕ МІНІСТРАЎ БССР.

№ 36 (683) | Субота, 4 верасня 1948 года. | Цана 50 кап.

АД ЦЭНТРАЛЬНАГА КАМІТЭТА ЎСЕСАЮЗНАЙ КОМУНІСТЫЧНАЙ ПАРТЫІ (большэвікоў) І СОВЕТА МІНІСТРАЎ САЮЗА ССР

Цэнтральны Камітэт Усесаюзнай Комуністычнай партыі (большэвікоў) і Совет Міністраў Саюза ССР з вялікім жалем паведамляюць партыі і ўсім працоўным Совецкага Саюза, што 31 жніўня ў 3 гадзіны 55 мінут дня пасля цяжкай хваробы памёр выдатны дзеяч нашай партыі і Совецкай дзяржавы, член Палітбюро ЦК ВКП(б), сакратар ЦК ВКП(б), дэпутат Вярхоўнага Совета СССР, генерал - палкоўнік таварыш АНДРЭЙ АЛЯКСАНДРАВІЧ ЖДАНАЎ.

Смерць таварыша А. А. ЖДАНАВА, вернага сына партыі Леніна—Сталіна, які прысвяціў усё сваё жыццё служэнню вялікай справе комунізма, з'яўляецца найцяжэйшай утратай для партыі і ўсяго совецкага народа.

У асобе таварыша ЖДАНАВА партыя страціла выдатнага марксісцкага тэарэтыка, таленавіцейшага прапагандыста вялікіх ідэй Леніна—Сталіна, аднаго з віднейшых будаўнікоў партыі і Совецкай дзяржавы.

Верны вучань і саратнік вялікага Сталіна таварыш ЖДАНАЎ сваёй кіпучай дзейнасцю на карысць совецкай Айчыны, сваёй беззаветнай адданасцю справе партыі Леніна—Сталіна заслужыў гарачую любоў партыі і ўсіх працоўных нашай Радзімы.

Жыццё таварыша АНДРЭЯ АЛЯКСАНДРАВІЧА ЖДАНАВА, які аддаў усю сваю палкую энергію справе будаўніцтва комунізма, будзе служыць прыкладам для працоўных нашай вялікай Совецкай Радзімы.

Цэнтральны Камітэт Усесаюзнай Комуністычнай партыі (большэвікоў)

Совет Міністраў Саюза ССР

Андрэй Аляксандравіч ЖДАНАЎ

31 жніўня пасля цяжкай хваробы памёр адзін з выдатных будаўнікоў і дзеячоў Комуністычнай партыі і Совецкай дзяржавы, член Палітбюро ЦК ВКП(б), сакратар ЦК ВКП(б), дэпутат Вярхоўнага Совета СССР, генерал-палкоўнік таварыш АНДРЭЙ АЛЯКСАНДРАВІЧ ЖДАНАЎ.

Андрэй Аляксандравіч ЖДАНАЎ нарадзіўся 26(14) лютага 1896 года ў горадзе Марыупалі ў сям'і інспектара народных вучылішчаў. 16-гадовым юнаком (у 1912 годзе) А. А. ЖДАНАЎ пасля пераезду яго бацькі ў Твер уступае ў рэволюцыйны рух, прымае ўдзел у соцыял-дэмакратычных гуртках вучнёўскай моладзі горада Тверы (цяпер гор. Калініна).

У рады большэвіцкай партыі А. А. ЖДАНАЎ уступае ў 1915 годзе. Ён вядзе актыўную партыйную работу ў рабочым раёне горада Тверы. Таварыш ЖДАНАЎ неўзабаве становіцца партыйным работнікам. У перыяд першай сусветнай вайны, будучы мабілізаваным у армію, ён вядзе большэвіцкую прапаганду сярод салдат, прымае ўдзел у падрыхтоўцы і правядзенні Вялікай Кастрычніцкай соцыялістычнай рэволюцыі на Урале. У гады грамадзянскай вайны таварыш ЖДАНАЎ займаецца палітычнай асветай у часцях Чырвонай Арміі, вядзе партыйную і совецкую работу на Урале і ў Тверы. З 1922 года тав. ЖДАНАЎ—старшыня Тверскога губвыканкома. У 1924—1934 гг. ён на кіруючай партыйнай рабоце ў Горкаўскім краі: сакратар Горкаўскага губкома, сакратар Горкаўскага крайкома ВКП(б).

На XIV з'ездзе ВКП(б) А. А. ЖДАНАЎ выбіраецца кандыдатам у члены ЦК ВКП(б), на XVI з'ездзе — членам ЦК ВКП(б), а пасля XVII з'езда ён выбіраецца сакратаром ЦК ВКП(б), кандыдатам у члены Палітбюро ЦК ВКП(б).

Таварыш ЖДАНАЎ вядзе вялікую партыйную і дзяржаўную работу. Ён аддае многа ўвагі пытанням ідэалогіі і марксісцка-ленінскай тэорыі. Яго выступленне на першым з'ездзе Саюза совецкіх пісьменнікаў намеціла важнейшыя задачы ў развіцці совецкай літаратуры.

У снежні 1934 года, пасля зладзейскага забойства С. М. Кірава, партыя пасылае таварыша А. А. ЖДАНАВА на работу ў ленінградскую партыйную арганізацыю, якую ён узначальвае ў перыяд з 1934 па 1944 год уключна.

Выконваючы волю партыі, А. А. ЖДАНАЎ з уласцівай яму большэвіцкай страснасцю натхняе і мабілізуе ленінградскую партыйную арганізацыю на разгром і выкарчоўванне трацкісцка-зіноўеўскіх двурушнікаў і здраднікаў, яшчэ цясней згуртоўвае ленінградскіх большэвікоў вакол ЦК ВКП(б) і таварыша Сталіна.

Напярэдадні XVIII з'езда ЦК ВКП(б) даручае тав. А. А. ЖДАНАВУ кіраўніцтва агітацыйна-прапагандысцкай работай партыі. Ён выступае таксама на XVIII з'ездзе партыі з дакладам па пытаннях партыйнага будаўніцтва. Усякае даручэнне партыі А. А. ЖДАНАЎ выконваў, аддаючыся яму ўсёй душой. Пасля XVIII з'езда партыі тав. ЖДАНАЎ выбіраецца членам Палітбюро ЦК ВКП(б).

У гады Вялікай Айчыннай вайны партыя і ўрад даручаюць таварышу А. А. ЖДАНАВУ арганізацыю справы абароны Ленінграда. Ажыццяўляючы ўказанні ЦК ВКП(б) і таварыша Сталіна, ленінградскія большэвікі, узначальваемыя таварышом ЖДАНАВЫМ, з'явіліся душой гераічнай абароны горада Леніна. За работу на Ленінградскім фронце тав. ЖДАНАВУ прысвойваецца спачатку званне генерал-лейтэнанта, а потым званне генерал-палкоўніка.

За сваю выдатную партыйную і ваенную работу тав. ЖДАНАЎ быў узнагароджан двума ордэнамі Леніна, ордэнам «Красное Знамя», ордэнам Суворава 1 ступені, ордэнам Кутузава 1 ступені, ордэнам Працоўнага Чырвонага Сцяга.

Пасля перамогі ў Вялікай Айчыннай вайне, калі партыя і народ перайшлі да мірнага будаўніцтва, віднае месца ў жыцці партыі і краіны занялі пытанні ідэалагічнай работы. З'яўляючыся выдатным марксісцкім тэарэтыкам і таленавіцейшым прапагандыстам вялікіх ідэй Леніна—Сталіна, таварыш ЖДАНАЎ выступае з радам бліскучых дакладаў па пытаннях літаратуры, мастацтва, філасофіі, па пытаннях міжнароднага становішча.

А. А. ЖДАНАЎ знаходзіўся ў першых радах кіруючых дзеячоў міжнароднага рабочага руху. Яго выступленні шырока вядомы працоўным усіх краін.

Верны вучань і саратнік вялікага Сталіна, таварыш ЖДАНАЎ з палкай энергіяй змагаўся за справу комунізма, ніколі не шкадаваў сваіх сіл і здароўя. Яго кіпучае жыццё і дзейнасць—прыклад самаадданага служэння партыі і народу. Гарачую любоў партыі і ўсіх працоўных ён заслужыў сваёй беззаветнай адданасцю вялікай справе Леніна — Сталіна, сваёй глыбокай прынцыповасцю, не дапускаючай якое-небудзь адхіленне ад генеральнай лініі партыі.

Бывай, наш дарагі друг і баявы таварыш!

А. АНДРЗЕЎ
Л. БЕРЫЯ
Н. БУЛГАНІН
Н. ВАЗНЕСЕНСКІ
К. ВАРАШЫЛАЎ
Л. КАГАНОВІЧ
А. КАСЫГІН
А. КУЗНЕЦОЎ
Г. МАЛЕНКОЎ
А. МІКАЯН
В. МОЛАТАЎ
П. ПАНАМАРЭНКА
Г. ПАПОЎ
І. СТАЛІН
М. СУСЛАЎ
Н. ХРУШЧОЎ
Н. ШВЕРНІК
М. ШКІРАТАЎ

Ад Цэнтральнага Камітэта Комуністычнай партыі (большэвікоў) Беларусі, Совета Міністраў і Прэзідыума Вярхоўнага Совета Беларускай ССР

Цэнтральны Камітэт КП(б) Беларусі, Совет Міністраў і Прэзідыум Вярхоўнага Совета Беларускай ССР выказваюць глыбокі смутак Комуністычнай партыі большэвікоў Беларусі і ўсяго беларускага народа з поваду заўчаснай смерці выдатнага дзеяча большэвіцкай партыі і Совецкай дзяржавы, вернага саратніка вялікага Сталіна, члена Палітбюро ЦК ВКП(б) і сакратара ЦК ВКП(б), дэпутата Вярхоўнага Совета СССР і Вярхоўнага Совета БССР таварыша Андрэя Аляксандравіча Жданава.

Усё жыццё таварыша Жданава—выдатны ўзор беззаветнай барацьбы за вялікую справу партыі Леніна—Сталіна, за комунізм.

У асобе таварыша Жданава партыя большэвікоў і ўвесь совецкі народ страцілі віднейшага тэарэтыка і палкага прапагандыста вучэння Леніна—Сталіна, выдатнага народнага трыбуна, непахіснага барацьбіта за большэвіцкую партыйнасць ідэалогіі і культуры.

Пакінуў нас адзін з выдатных будаўнікоў партыі і Совецкай дзяржавы, выдатны арганізатар соцыялістычнага будаўніцтва і бліскучых перамог совецкага народа ў Вялікай Айчыннай вайне.

Светлы вобраз горача любімага партыяй і совецкім народам Андрэя Аляксандравіча Жданава будзе вечна жыць у памяці беларускага народа, натхняючы яго на самаадданую барацьбу за таржаство ідэй Леніна—Сталіна, за поўную перамогу комунізма.

Цэнтральны Камітэт КП(б) Беларусі
Совет Міністраў БССР
Прэзідыум Вярхоўнага Совета БССР

Ад Мінскага абкома КП(б)Б і аблвыканкома

Мінскі абласны камітэт КП(б) Беларусі і абласны Совет дэпутатаў працоўных глыбока смуткуюць аб цяжкай утраце, якая пасцігла партыю і совецкі народ,—аб смерці выдатнага дзеяча большэвіцкай партыі і Совецкай дзяржавы, члена Палітбюро ЦК ВКП(б), сакратара ЦК ВКП(б), дэпутата Вярхоўнага Совета СССР таварыша Жданава Андрэя Аляксандравіча.

Памяць пра Андрэя Аляксандравіча Жданава—вернага саратніка вялікага Сталіна—будзе вечна жыць у сэрцах працоўных, будзе натхняць іх на самаадданую барацьбу за перамогу комунізма ў нашай краіне.

Мінскі абком КП(б)Б.

Мінскі аблвыканком.

Ад Мінскага гарадскога камітэта Комуністычнай партыі (большэвікоў) Беларусі і Мінскага гарадскога Совета дэпутатаў працоўных

Мінскі гарадскі камітэт комуністычнай партыі (большэвікоў) Беларусі і гарадскі Совет дэпутатаў працоўных разам з усім совецкім народам глыбока смуткуюць з поваду смерці выдатнага кіраўніка большэвіцкай партыі і Совецкай дзяржавы, бліжэйшага саратніка таварыша Сталіна, члена Палітбюро ЦК ВКП(б) і сакратара ЦК ВКП(б), дэпутата Вярхоўнага Совета СССР і БССР, дэпутата Мінскага гарадскога Совета дэпутатаў працоўных — генерал-палкоўніка Андрэя Аляксандравіча Жданава.

Усё сваё свядомае жыццё таварыш Жданаў прысвяціў барацьбе за справу рабочага класа, з'яўляўся сцяганосцам ленінска - сталінскіх ідэй, адным з віднейшых тэарэтыкаў нашай партыі, таленавіцейшых арганізатараў будаўніцтва соцыялізма ў нашай краіне.

Сваім беззаветным служэннем справе комунізма таварыш Жданаў заслужыў гарачую любоў у працоўных Совецкага Саюза.

Смерць Андрэя Аляксандравіча Жданава — найцяжэйшая ўтрата для партыі і совецкага народа.

Слаўны жыццёвы шлях Андрэя Аляксандравіча Жданава заўсёды будзе для нас прыкладам беззаветнай адданасці партыі Леніна—Сталіна, совецкаму народу.

Светлы вобраз таварыша Жданава будзе натхняць працоўных Совецкай Беларусі, як і ўвесь совецкі народ, на далейшую самаадданую барацьбу за поўную перамогу комунізма.

Мінскі гарадскі камітэт Комуністычнай партыі (большэвікоў) Беларусі.

Мінскі гарадскі Совет дэпутатаў працоўных.

Ад Прэзідыума Вярхоўнага Совета СССР

Прэзідыум Вярхоўнага Совета Саюза Совецкіх Соцыялістычных Рэспублік з глыбокім жалем паведамляе аб смерці выдатнага дзеяча Комуністычнай партыі і Совецкай дзяржавы, самаадданага барацьбіта за справу працоўных і палкага патрыёта совецкай соцыялістычнай Радзімы, члена Палітбюро ЦК ВКП(б), сакратара ЦК ВКП(б), дэпутата Вярхоўнага Совета СССР, генерал-палкоўніка таварыша Андрэя Аляксандравіча Жданава.

Прэзідыум Вярхоўнага Совета СССР.

Ад Прэзідыума Вярхоўнага Совета і Совета Міністраў Расійскай Совецкай Федэратыўнай Соцыялістычнай Рэспублікі

Прэзідыум Вярхоўнага Совета і Совет Міністраў Расійскай Совецкай Федэратыўнай Соцыялістычнай Рэспублікі з глыбокім жалем паведамляюць працоўных Расійскай Федэрацыі аб заўчаснай смерці вернага саратніка вялікага Сталіна, выдатнага дзеяча большэвіцкай партыі і Совецкай дзяржавы, члена Палітбюро Цэнтральнага Камітэта Ўсесаюзнай Комуністычнай партыі (большэвікоў), сакратара ЦК ВКП(б), дэпутата Вярхоўнага Совета СССР, дэпутата Вярхоўнага Совета РСФСР, генерал - палкоўніка таварыша Андрэя Аляксандравіча Жданава.

Верны сын вялікага рускага народа Андрэй Аляксандравіч Жданаў аддаў усё сваё жыццё рэволюцыйнай барацьбе за справу рабочага класа, за комунізм.

Імя Андрэя Аляксандравіча Жданава бязмежна дорага і блізка народам Расійскай Федэрацыі. На працягу раду год Андрэй Аляксандравіч Жданаў з'яўляўся Старшынёй Вярхоўнага Совета Расійскай Совецкай Федэратыўнай Соцыялістычнай Рэспублікі. У цяжкія гады Вялікай Айчыннай вайны таварыш А. А. Жданаў аддаваў усе свае сілы справе абароны Радзімы і непасрэдна кіраваў гераічнай абаронай горада Леніна.

Светлы вобраз дарагога Андрэя Аляксандравіча Жданава, які прысвяціў усё сваё жыццё будаўніцтву большэвіцкай партыі і Совецкай дзяржавы, будзе служыць для працоўных нашай краіны прыкладам беззаветнай барацьбы за поўную перамогу комунізма.

Прэзідыум Вярхоўнага Совета РСФСР.

Совет Міністраў РСФСР.

Ад Саюза совецкіх пісьменнікаў БССР

Комуністычная партыя і народы Совецкага Саюза панеслі велізарнейшую ўтрату—памёр верны сын нашай Радзімы, выдатнейшы дзеяч большэвіцкай партыі і Совецкай дзяржавы, бліжэйшы саратнік вялікага Сталіна—Андрэй Аляксандравіч Жданаў.

У асобе таварыша Жданава совецкія пісьменнікі страцілі свайго лепшага друга і ідэйнага кіраўніка. Заняты важнейшымі дзяржаўнымі справамі, Андрэй Аляксандравіч Жданаў знаходзіў час і магчымасць удзяляць вялікую ўвагу совецкай літаратуры і мастацтву. Ён заўсёды нястомна клапаціўся аб іх развіцці, іх ідэйным і мастацкім росце.

З большэвіцкай непрымірымасцю таварыш Жданаў бічаваў буржуазныя перажыткі ў асяроддзі пісьменнікаў, выкрываў антынароднасць і рэакцыйнасць тэорыі «мастацтва для мастацтва», праявы фармалізма і нізкапаклонства перад Захадам.

Андрэй Аляксандравіч Жданаў горача змагаўся за ленінска-сталінскую партыйнасць совецкай літаратуры, за яе соцыялістычную народнасць. Будучы глыбокім марксісцка-ленінскім тэарэтыкам у галіне літаратуры і мастацтва, ён нястомна змагаўся за ажыццяўленне ўказанняў таварыша Сталіна аб соцыялістычным рэалізме, як адзіна правільным творчым метадзе совецкай літаратуры—самай праўдзівай і самай перадавой літаратуры свету.

Совецкія пісьменнікі Беларусі заўсёды адчувалі і высока цанілі клопаты тав. Жданава аб совецкай літаратуры. Яго мудрыя ўказанні былі для нас указаннямі нашай партыі. Яны дапамагалі нам пазбавіцца памылак і недахопаў у творчай працы, натхнялі нас на напісанне высокаідэйных твораў, якія выхоўвалі совецкіх людзей у духу комунізма.

Глыбокія думкі, выказаныя Андрэем Аляксандравічам Жданавым, назаўсёды застануцца для нас дарагімі і незабыўнымі. Яны і надалей будуць асвятляць шляхі развіцця совецкай літаратуры і мастацтва.

Саюз совецкіх пісьменнікаў БССР.

Ад Прэзідыума Акадэміі навук БССР

Прэзідыум Акадэміі навук БССР ад імя ўсяго калектыва супрацоўнікаў Акадэміі выказвае глыбокае спачуванне з поваду заўчаснай смерці аднаго з бліжэйшых саратнікаў вялікага Сталіна, вернага вучня Леніна, выдатнага дзеяча большэвіцкай партыі і Совецкай дзяржавы, сакратара ЦК ВКП(б) таварыша Жданава Андрэя Аляксандравіча.

Таварыш Жданаў А. А. быў увасабленнем мудрасці і высокага інтэлекта нашай ленінска-сталінскай партыі, чыстаты яе ідэалогіі і несакрушальнай волі ў абароне інтарэсаў совецкай соцыялістычнай дзяржавы як у гады вайны, так і ў гады міру.

Многанацыянальны совецкі народ ніколі не забудзе таварыша Жданава, як выдатнага кіраўніка слаўнай ленінградскай большэвіцкай арганізацыі і працоўных гераічнага горада Леніна, які правёў ленінградскіх большэвікоў і працоўных праз гады перамог сталінскіх пяцігодак і гераічнай абароны Ленінграда ў дні Вялікай Айчыннай вайны.

Вучоныя і ўся совецкая інтэлігенцыя ніколі не забудуць вернага вучня і саратніка Леніна і Сталіна Андрэя Аляксандравіча Жданава, як барацьбіта за чыстату ідэалогіі нашай слаўнай большэвіцкай партыі і многамільённага і многанацыянальнага совецкага народа.

У развіцці і росквіце совецкай соцыялістычнай культуры і навукі таварыш Жданаў адыграў выдатную ролю. У гісторыю совецкай ідэалогіі, культуры і навукі ўвойдуць залатым фондам дзеянні таварыша Жданава, які заўсёды і няспынна змагаўся за таржаство ідэй Маркса—Энгельса—Леніна — Сталіна.

Ушаноўваючы памяць любімага Андрэя Аляксандравіча Жданава, мы, вучоныя Совецкай Беларусі, будзем адстайваць чыстату ленінска-сталінскай ідэалогіі ў навуцы і культуры, за развіццё і таржаство якой усё жыццё нястомна змагаўся верны сын ленінска-сталінскай партыі Андрэй Аляксандравіч Жданаў.

Прэзідыум Акадэміі навук БССР.

АНДРЭЙ АЛЯКСАНДРАВІЧ ЖДАНАЎ

ПАХАВАННЕ АНДРЭЯ АЛЯКСАНДРАВІЧА ЖДАНАВА

Жалобны мітынг на Краснай плошчы

Прамова таварыша В. М. МОЛАТАВА

АД ЦЭНТРАЛЬНАГА КАМІТЭТА ВКП(б) І СОВЕТА МІНІСТРАЎ САЮЗА ССР

Таварышы!

З глыбокім жалем совецкі народ развітваецца сёння з Андрэем Аляксандравічам Жданавым.

Большэвіцкая партыя і Совецкая дзяржава панеслі цяжкую ўтрату. Мы лішыліся выдатнага дзеяча комуністычнай партыі і Совецкай дзяржавы, аднаго з любімейшых сыноў совецкага народа, вернага вучня і таленавітага саратніка вялікага Сталіна.

Яшчэ юнаком таварыш Жданаў уступіў у рады большэвіцкай партыі. З гэтага часу, на працягу 33 гадоў, жыццёвы шлях таварыша Жданава з'яўляецца прыкладам беззаветнага служэння свайму народу, вялікай справе Леніна—Сталіна.

Андрэй Аляксандравіч Жданаў пачаў сваю большэвіцкую работу яшчэ ў дарэволюцыйныя гады сярод рабочых горада Тверы. Ён працягвае рэволюцыйную дзейнасць сярод салдат, будучы мабілізаваным у армію ў перыяд першай сусветнай вайны. Ён удзельнічае ў падрыхтоўцы і правядзенні Вялікай Кастрычніцкай соцыялістычнай рэволюцыі на Урале. У гады грамадзянскай вайны ён вядзе работу па палітычнай асвеце ў часцях Чырвонай Арміі, а затым—партыйную і совецкую работу на Урале і ў Тверы.

На працягу дзесяцігоддзя, з 1924 па 1934 год, таварыш Жданаў кіруе партыйнай арганізацыяй Горкаўскага краю. У гэтыя гады барацьбы за ленінска-сталінскую генеральную лінію партыі таварыш Жданаў высока трымае сцяг большэвіцкай партыйнасці, глыбока ўваходзіць у практычныя справы гаспадарчага будаўніцтва краіны, натхнёна абараняючы ідэйныя пазіцыі комунізма. У гэтыя гады таварыш Жданаў уваходзіць у Сталінскае ядро нашай партыі, якое пасля смерці Владзіміра Ільіча Леніна пад кіраўніцтвам таварыша Сталіна адстаяла і яшчэ вышэй узняла ленінскі сцяг, яшчэ мацней згуртавала нашу партыю і ўвесь совецкі народ і прывяло нашу краіну да перамогі соцыялізма.

Пасля зладзейскага забойства Сяргея Міронавіча Кірава партыя накіроўвае таварыша Жданава ў Ленінград. Тут ён узначальваў партыйную арганізацыю ў перыяд 1934—1944 гадоў, заслужыўшы гарачую любоў і павагу працоўных Ленінграда. Пад кіраўніцтвам таварыша Жданава ленінградскія большэвікі разграмілі і выкаранілі ахвосце трацкістаў, бухарынцаў і іншых здраднікаў і агентаў іншаземных разведак, яшчэ шчыльней згуртаваўшы працоўных Ленінграда вакол ЦК ВКП(б) і таварыша Сталіна. Тут, у горадзе Леніна, разгарнуўся яго выдатны талент большэвіцкага арганізатара і выдатнага палітычнага кіраўніка.

У гады Вялікай Айчыннай вайны партыя і ўрад усклалі на таварыша Жданава арганізацыю справы абароны Ленінграда. Мы памятаем гэтыя цяжкія месяцы гітлераўскай асады Ленінграда, калі патрэбна была найвялікшая мужнасць і гераізм ад нашых ленінградцаў. Ідучы за ўказаннямі таварыша Сталіна, ленінградскія большэвікі на чале з таварышом Жданавым з'явіліся душой гераічнай абароны горада Леніна. Яны адстаялі гэты горад-герой і пад кіраўніцтвам таварыша Жданава быў ажыццёўлены сталінскі план разгрому немцаў пад Ленінградам.

У апошнія гады асабліва шырока разгарнуліся яго здольнасці, як выдатнага тэарэтыка марксізма. Бліскучыя даклады таварыша Жданава па пытаннях літаратуры, мастацтва і філасофіі з'яўляюцца важным укладам у развіццё марксісцка-ленінскай тэорыі і ў многім садзейнічаюць пераадоленню маючыхся тут недахопаў, раскрываючы новыя шляхі развіцця соцыялістычнай культуры ў нашай краіне. Гэтым ён паказаў прыклад большэвіцкага кіраўніка, які ўмела спалучае ўдзел у штодзённым будаўніцтве з глыбокай працай пад пытаннямі тэорыі марксізма. Як таленавіцейшы прапагандыст вялікіх ідэй Леніна—Сталіна, таварыш Жданаў у многім дапамог правільнаму засваенню гэтых ідэй нашым народам і народамі іншых краін.

У напружанай і натхнёнай ідэйнай рабоце апошняга часу таварыш Жданаў стаяў ў першых радах кіруючых дзеячоў міжнароднага рабочага руху. Мы ўсе ведаем яго слаўныя заслугі ў справе згуртавання сіл міжнароднага антыімперыялістычнага і дэмакратычнага лагеру супроць усіх і ўсялякіх падпальшчыкаў новай вайны. Працоўныя ўсіх краін ведаюць і помняць аб гэтым.

Жыццё і дзейнасць таварыша Жданава — прыклад самаадданага служэння свайму народу, прыклад палымянага барацьбіта за справу комунізма, якім павінен быць верны вучань і саратнік вялікага Сталіна. Таварыш Жданаў не шкадаваў сваіх сіл і здароўя, непадзельна аддаючыся служэнню партыі з усёй сваёй невычарпальнай энергіяй і энтузіязмам. Сваёй глыбокай прынцыповасцю і непахіснасцю ў абароне генеральнай лініі партыі, сваёй беззаветнай адданасцю вялікай справе Леніна—Сталіна таварыш Жданаў заслужыў вялікую любоў і глыбокую павагу партыі і ўсяго нашага народа.

Бывай, наш дарагі друг, наш баявы таварыш!

Прамова таварыша П. С. ПАПКОВА

АД ПРАЦОЎНЫХ ЛЕНІНГРАДА

Таварышы!

Перастала біцца палымянае сэрца Андрэя Аляксандравіча Жданава — выдатнага дзеяча большэвіцкай партыі і Совецкай дзяржавы, вернага вучня і саратніка вялікага Сталіна. Смерць таварыша Жданава з'яўляецца найцяжэйшай стратай для большэвіцкай партыі і ўсяго совецкага народа.

Для нас, ленінградцаў, гэтая страта асабліва вялікая. На працягу дзесяці год Андрэй Аляксандравіч кіраваў ленінградскай партыйнай арганізацыяй.

Таварыш Жданаў быў накіраваны ў Ленінград Цэнтральным Камітэтам партыі і таварышам Сталіным пасля зладзейскага забойства Сяргея Міронавіча Кірава.

Андрэй Аляксандравіч Жданаў з уласцівай яму страснасцю і нястомнай энергіяй мабілізаваў ленінградскіх большэвікоў на разгром і выкарчоўванне трацкісцка-зіноўеўскіх здраднікаў і яшчэ шчыльней згуртаваў ленінградскую партыйную арганізацыю вакол Цэнтральнага Камітэта большэвіцкай партыі, вакол правадыра і настаўніка таварыша Сталіна.

Узначальваючы ленінградскую партыйную арганізацыю, Андрэй Аляксандравіч аддаў шмат сіл і энергіі для росквіту соцыялістычнай прамысловасці, сельскай гаспадаркі, культуры і мастацтва Ленінграда і Ленінградскай вобласці.

Працоўныя горада Леніна ніколі не забудуць той велізарнай арганізатарскай дзейнасці, якую праводзіў Андрэй Аляксандравіч Жданаў па згуртаванню ленінградцаў на працоўныя подзвігі у імя перамогі комунізма ў нашай краіне.

У цяжкія гады Вялікай Айчыннай вайны партыя і ўрад, асабіста таварыш Сталін, даручылі Андрэю Аляксандравічу кіраваць абаронай Ленінграда.

Таварыш Жданаў згуртоўваў і натхняў гераічных абаронцаў Ленінграда на баявыя подзвігі, накіроўваючы ўсе сілы на абарону любімага горада, на разгром нямецка-фашысцкіх захопнікаў.

З імем Андрэя Аляксандравіча Жданава звязана вялікая перамога Совецкай Арміі пад Ленінградам.

Сваёй беззаветнай барацьбой за вялікую справу Леніна—Сталіна Андрэй Аляксандравіч заслужыў гарачую любоў і бязмежную павагу ўсіх працоўных Ленінграда і Ленінградскай вобласці. Яго імя блізка і дарагое сэрцу кожнага ленінградца, кожнага совецкага чалавека.

Андрэй Аляксандравіч быў буйнейшым палітычным дзеячам ленінска-сталінскага тыпу, выдатным марксістам - тэарэтыкам і палымяным прапагандыстам ідэй комунізма.

Таварыш Жданаў з большэвіцкай страснасцю і непрымірымасцю змагаўся за далейшы росквіт совецкай навукі, культуры і мастацтва супроць буржуазнай ідэалогіі, супроць падпальшчыкаў новай вайны, за трывалы і працяглы мір, за народную дэмакратыю.

Увесь совецкі народ, кіруемы вялікім Сталіным, напружана змагаецца за выкананне пасляваеннай пяцігодкі ў чатыры гады. Совецкіх людзей у гэтай усенароднай барацьбе за далейшы росквіт і ўмацаванне магутнасці нашай Радзімы будзе натхняць на новыя подзвігі светлы вобраз Андрэя Аляксандравіча Жданава. Жыццё і дзейнасць Андрэя Аляксандравіча Жданава будзе заўсёды з'яўляцца для працоўных яркім прыкладам беззаветнага служэння Радзіме, народу, справе Леніна—Сталіна.

Бывай, наш дарагі і любімы Андрэй Аляксандравіч! Мы аддадзім усе нашы сілы вялікай справе комунізма, якой ты прысвяціў сваё цудоўнае жыццё!

Прамова Маршала Совецкага Саюза тав. Л. А. ГОВАРАВА

АД МІНІСТЭРСТВА ЎЗБРОЕНЫХ СІЛ СССР

Таварышы!

Сёння Узброеныя Сілы Совецкага Саюза разам з усім нашым народам развітваюцца з выдатным дзеячам большэвіцкай партыі і Совецкай дзяржавы, членам Палітбюро і сакратаром Цэнтральнага Камітэта Усесаюзнай Комуністычнай партыі большэвікоў, генерал - палкоўнікам Андрэем Аляксандравічам Жданавым.

Совецкія воіны схіляюць сёння свае баявыя сцягі ля труны таварыша Жданава. Яны глыбока смуткуюць з прычыны пяжкай страты, якую панесла наша Радзіма і яе Узброеныя Сілы.

Верны вучань і баявы саратнік вялікага Сталіна, Андрэй Аляксандравіч Жданаў належаў да слаўнага кіруючага ядра партыі большэвікоў, таго ядра, якое ў суровай барацьбе адстаяла непераможны сцяг Леніна—Сталіна і прывяло совецкі народ да таржаства соцыялізма.

Усю сваю нястомную энергію, магутны талент большэвіка-арганізатара, бліскучага марксісцкага тэарэтыка і палымянага прапагандыста ідэй Леніна—Сталіна таварыш Жданаў аддаў справе будаўніцтва большэвіцкай партыі і Совецкай дзяржавы, справе комунізма.

Сваім беззаветным служэннем нашай Радзіме таварыш Жданаў заслужыў гарачую любоў партыі і ўсіх працоўных, гарачую любоў усіх совецкіх воінаў.

Таварыш Жданаў адыграў буйную ролю ў будаўніцтве Узброеных Сіл нашай краіны. Андрэй Аляксандравіч нястомна змагаўся за ажыццяўленне вялікіх сталінскіх планаў будаўніцтва соцыялізма, за ўмацаванне ваеннай магутнасці соцыялістычнай Радзімы.

Таварыш Жданаў шмат сіл і энергіі аддаў справе ідэйна-палітычнага выхавання асабовага саставу Совецкай Арміі і Ваенна-Марскога Флота.

Яшчэ ў перадваенныя гады на пасту члена Галоўнага Ваеннага Совета Ваенна-Марскога Флота — Андрэй Аляксандравіч аказаў Ваенна-Марскім Сілам вялікую дапамогу. З яго імем непарыўна звязана баявая слава нашага флота.

У гады Вялікай Айчыннай вайны супроць фашысцкіх захопнікаў таварыш Жданаў аддаваў усе свае сілы справе абароны Радзімы, справе разгрому ворага. Большэвіцкая партыя, Совецкі Урад, асабіста таварыш Сталін накіравалі таварыша Жданава на адзін з важнейшых франтоў вайны—на абарону Ленінграда.

Таварыш Жданаў — кіраўнік ленінградскіх большэвікоў быў душой гераічнай абароны горада Леніна. У цяжкі час блакады Андрэй Аляксандравіч згуртаваў усе сілы абаронцаў Ленінграда ў адзіны баявы каляктыў і накіраваў іх волю і энергію на барацьбу за разгром нямецка-фашысцкіх захопнікаў. Войскі Ленінградскага фронта і ўсе абаронцы Ленінграда заўсёды адчувалі выдатную ролю і ўплыў Андрэя Аляксандравіча. Пад яго кіраўніцтвам войскі Ленінградскага фронта нанеслі ворагу не адзін сакрушальны ўдар, адстаялі калыбель соцыялістычнай рэволюцыі — горад Леніна ад фашысцкіх захопнікаў і разграмілі гітлераўскія полчышчы.

За выдатную ваенную работу таварышу Жданаву было прысвоена званне генерал-палкоўніка. Ён быў узнагароджаны вышэйшымі палкаводчымі ордэнамі.

Светлы вобраз Андрэя Аляксандравіча Жданава назаўсёды захаваецца ў памяці совецкіх воінаў і будзе для ўсіх нас прыкладам беззаветнага служэння совецкай Радзіме.

Вечная слава і памяць баявому таварышу Андрэю Аляксандравічу Жданаву!

Прамова таварыша Г. М. ПАПОВА

АД ПРАЦОЎНЫХ МАСКВЫ І МАСКОЎСКАЙ ВОБЛАСЦІ

Таварышы!

Цяжкае гора спасцігла нашу большэвіцкую партыю і ўвесь совецкі народ. Перастала біцца благароднае сэрца палымянага барацьбіта за комунізм — таварыша Андрэя Аляксандравіча Жданава. Адышоў ад нас адзін з віднейшых дзеячоў і будаўнікоў большэвіцкай партыі і Совецкай дзяржавы, верны вучань і бліжэйшы саратнік вялікага Сталіна.

Рабочыя, калгаснікі, інтэлігенцыя Масквы і Маскоўскай вобласці разам з усім совецкім народам бязмерна смуткуюць аб гэтай найцяжэйшай утраце.

Усё сваё свядомае жыццё таварыш Жданаў прысвяціў беззаветнаму служэнню комунізма. Юнаком ён уступіў у рады нашай партыі і першую рэволюцыйную загартоўку атрымаў у большэвіцкім падполлі. У гады пасля Вялікай Кастрычніцкай соцыялістычнай рэволюцыі таварыш Жданаў самааддана працаваў на розных участках партыйнага і совецкага будаўніцтва. Ён прайшоў слаўны шлях большэвіцкага кіраўніка, арганізатара мас, ад старшыні павятовага партыйнага камітэта да сакратара Цэнтральнага Камітэта Усесаюзнай Комуністычнай партыі (большэвікоў) і члена Палітбюро ЦК ВКП(б).

Вязмежна адданы вялікай справе Леніна—Сталіна, таварыш Жданаў на працягу ўсёй сваёй дзейнасці стойка і паслядоўна змагаўся за генеральную лінію партыі. На чатырнаццатым партыйным з'ездзе ён з большэвіцкай страснасцю і ўпэўненасцю выступаў супроць трацкісцка-зіноўеўскіх двурушнікаў і здраднікаў. У 1934 годзе, пасля зладзейскага забойства Сяргея Міронавіча Кірава, партыя накіравала таварыша Жданава, вярнейшага і выпрабаванага ленінца-сталінца ў ленінградскую партыйную арганізацыю, дзе ён узначаліў барацьбу за разгром агідных ворагаў соцыялізма і яшчэ больш згуртаваў ленінградскую партыйную арганізацыю вакол ленінска-сталінскага Цэнтральнага Камітэта.

У гады Вялікай Айчыннай вайны выдатны патрыёт совецкай Радзімы таварыш Жданаў кіраваў гераічнай абаронай Ленінграда. У пасляваенны перыяд Андрэю Аляксандравічу Жданаву належыць выдатная роля ў арганізацыі ідэалагічнай работы партыі, у мабілізацыі сіл працоўных на ажыццяўленне сталінскага пяцігадовага плана.

Выступаючы на ўрачыстым паседжанні Маскоўскага Совета дэпутатаў працоўных 6 лістапада 1946 года, таварыш Жданаў гаварыў:

«Перад нашым народам стаяць вялікія задачы. Мы, ленінцы, упэўнены, што гэтыя задачы будуць з поспехам выкананы. За гэта гаворыць увесь вопыт соцыялістычнага будаўніцтва ў СССР. За гэта гаворыць мудрая палітыка большэвіцкай партыі і вялікага Сталіна. За гэта гаворыць адзінадушная падтрымка палітыкі партыі ўсім нашым народам».

Сваю вялікую і шматгранную арганізатарскую дзейнасць таварыш Жданаў бліскуча спалучаў з глыбокай і творчай распрацоўкай важнейшых пытанняў марксісцка-ленінскай тэорыі. Яго вызначальнай рысай было ўменне ўсебакова аналізаваць буйнейшыя праблемы палітыкі, эканомікі і культуры. У той-жа час Андрэй Аляксандравіч валодаў кашчтоўнейшай якасцю большэвіка-прапагандыста — у яснай, вобразнай і даступнай форме даводзіць ідэі комунізма да шырокіх мас працоўных.

Андрэй Аляксандравіч паказваў прыклад нястомнага ўдасканальвання сваіх ведаў. Ён быў чалавекам вялікай і рознабаковай культуры. Выступленні таварыша Жданава па пытаннях філасофіі, літаратуры і мастацтва вызначалі шляхі далейшага развіцця совецкай навукі і культуры. Яны былі прасякнуты вялікай большэвіцкай страснасцю і клопатамі аб комуністычным выхаванні працоўных.

Плённая дзейнасць Андрэя Аляксандравіча Жданава ў галіне ідэалагічнага выхавання совецкага народа мела выключнае значэнне для Масквы — важнейшага палітычнага, навуковага і культурнага цэнтра нашай Радзімы.

Імя Андрэя Аляксандравіча Жданава, віднейшага дзеяча міжнароднага рабочага руху, было шырока вядома працоўным усяго свету. Таварыш Жданаў унёс вялікі ўклад у справу згуртавання дэмакратычных сіл у іх барацьбе супроць імперыялістычнай рэакцыі.

Слаўнае жыццё таварыша Жданава абарвалася ў тыя дні, калі совецкі народ, пад кіраўніцтвам большэвіцкай партыі, ажыццяўляючы сталінскія прадначартанні, упэўнена ідзе да комунізма.

Заўсёды будуць гучаць для нас баявым заклікам словы таварыша Жданава, сказаныя ім у дакладзе на XVIII з'ездзе партыі:

«... Мы, байцы арміі вялікіх пролетарскіх стратэгаў, арміі Леніна—Сталіна, згуртаваныя вакол ленінска-сталінскага ЦК, вакол свайго настаўніка і правадыра таварыша Сталіна, пранясем свой, абвеяны славай, большэвіцкі сцяг да поўнай перамогі комунізма».

Светлы вобраз Андрэя Аляксандравіча Жданава, яго гераічны жыццёвы шлях будуць натхняць совецкіх людзей на новыя подзвігі ў імя далейшага ўмацавання магутнасці нашай соцыялістычнай Радзімы.

ВЯЛІКІ ДЗЕЯЧ НАВУКІ

Раніцой 1-га верасня ў Акадэміі навук БССР адбыўся жалобны мітынг з прычыны смерці лепшага сына совецкага народа, выдатнага дзеяча большэвіцкай партыі Андрэя Аляксандравіча Жданава.

— Нашы сэрцы апаліла гораччу нечаканая вестка аб смерці дарагога і любімага Андрэя Аляксандравіча Жданава, — сказаў, адкрываючы мітынг, сакратар парткома тав. Майсееў.

Тав. Майсееў коратка расказвае пра слаўны жыццёвы шлях таварыша Жданава, пра яго нястомную барацьбу за шчасце працоўных, за пабудову соцыялістычнага грамадства ў нашай краіне.

Затым выступіў сапраўдны член Акадэміі навук тав. М. Мацэпура.

— Важнейшыя перамогі совецкага народа ў Вялікай Айчыннай вайне, — гаворыць ён, — а таксама на фронце соцыялістычнага будаўніцтва непарыўна звязаны з імем Андрэя Аляксандравіча Жданава. Таварышу Жданаву комуністычная партыя даручала самыя адказныя заданні, і ён з гонарам заўсёды выконваў іх.

Андрэй Аляксандравіч быў адным з адукаванейшых людзей, меў надзвычай шырокі навуковы кругазор. Яго творы і выказванні па пытаннях філасофіі, літаратуры і музыкі назаўсёды застануцца ў залатым фондзе совецкай навукі.

А. А. Жданаў памёр, але яго слаўнае жыццё для мільёнаў працоўных совецкай краіны будзе з'яўляцца яркім прыкладам нястомнага служэння свайму народу, роднай і любімай комуністычнай партыі.

На жалобным мітынгу выступілі: сапраўдны член Акадэміі навук Т. Годнеў, член - карэспандэнт М. Лынькоў, доктар гістарычных навук А. П'янкоў, навуковы супрацоўнік Акадэміі навук Т. Русінаў і аспірант Т. Івашын.

ЖАЛОБНЫЯ СХОДЫ ПАМЯЦІ ТАВАРЫША А. А. ЖДАНАВА У ГАРАДАХ І СЁЛАХ КРАІНЫ

З усіх канцоў краіны паступаюць паведамленні аб жалобных сходах памяці выдатнага дзеяча большэвіцкай партыі і Совецкай дзяржавы таварыша А. А. Жданава, якія адбыліся на прадпрыемствах, у калгасах і ва ўстановах.

У Маскве, Ленінградзе, Кіеве, Свярдлоўску, Чалябінску, Тбілісі, Таліне, Сталінабадзе, Новасібірску, Хабараўску, Омску, Ульянаўску, Луцку, Ужгарадзе і многіх іншых гарадах адбыліся шматлюдныя жалобныя сходы. Аб дачаснай смерці таварыша Жданава смуткуюць аружэйнікі г. Тулы, будаўнікі Калінінградскай вобласці, металургі Урала, шахцёры Караганды і Крывога Рогу, нафтавікі Баку і Грознага, рабочыя заводаў Ніжняга Тагіла, Бранску, Варонежу, Львова і Херсона, калгаснікі сельскагаспадарчай арцелі імя Жданава, Шаўчэнкаўскага раёна, Харкаўскай вобласці, арцелі імя Жданава ў Туркменіі, калгаснікі Алтая, Яраслаўскай, Владзімірскай, Смаленскай, Чарновіцкай, Пензенскай і іншых абласцей СССР.

... Шматлюдныя жалобныя сходы прайшлі ў часцях Совецкай Арміі, на караблях чырвонасцяжнай балтыкі, Чарнаморскага і іншых флотаў Ваенна-Марскіх Сіл СССР.

(ТАСС)

27 МІЛЬЁНАЎ БРАШУР З ДАКЛАДАМІ ТАВ. А. А. ЖДАНАВА

Выступленні таленавіцейшага прапагандыста вялікіх ідэй Леніна—Сталіна, выдатнага марксісцкага тэарэтыка А. А. Жданава па пытаннях партыйнага будаўніцтва, літаратуры, мастацтва, філасофіі, міжнароднага становішча карыстаюцца вялікай папулярнасцю.

Мільённымі экземплярамі выйшлі ў свет брашуры «Змены ва Уставе ВКП(б)»—даклад тав. А. А. Жданава на XVIII з'ездзе ВКП(б) 18-га сакавіка 1939 года і «Дваццаць дзевятая гадавіна Вялікай Кастрычніцкай соцыялістычнай рэволюцыі»—даклад тав. А. А. Жданава на ўрачыстым паседжанні Маскоўскага Совета 6-га лістапада 1946 года. Масавымі тыражамі выдадзены даклад аб часопісах «Звязда» і «Ленінград» на сходзе партыйнага актыва і на сходзе пісьменнікаў у Ленінградзе, выступленне на дыскусіі па кнізе Г. Ф. Аляксандрава «Гісторыя Заходне-еўрапейскай філасофіі» 24-га чэрвеня 1947 г. Даклад аб міжнародным становішчы, зроблены на інфармацыйнай нарадзе прадстаўнікоў некаторых компартый у Польшчы ў канцы верасня 1947 года, і іншыя выступленні А. А. Жданава.

Агульны тыраж брашур з дакладамі і выступленнямі тав. А. А. Жданава складае 27 мільёнаў 887 тысяч экземпляраў. Яны выдадзены на 57 мовах.

(ТАСС)

АНДРЭЙ АЛЯКСАНДРАВІЧ ЖДАНАЎ

У АПОШНІ ШЛЯХ

2 верасня Масква праводзіла ў апошні шлях Андрэя Аляксандравіча Жданава—выдатнага дзеяча большэвіцкай партыі і Совецкай дзяржавы.

... Закончылася першая вераснёўская ноч. Над сталіцай уставала світанне. Дзесяткі тысяч масквічоў не спалі ў гэту жалобную ноч. Два вялікія людскія патокі бесперапынна ўліваліся ў Дом Саюзаў. Рабочыя, работніцы, інжынеры і тэхнікі сталічных прадпрыемстваў спяшалі пасля начной змены ў Калонную залю, каб развітацца з дачасна памёршым любімцам партыі і народа—таварышам Андрэем Аляксандравічам Жданавым.

Тысячы людзей з непакрытымі галовамі праходзяць перад труной вернага вучня і саратніка вялікага Сталіна—таварыша А. А. Жданава. Бясшумна змяняецца ганаровая варта. Гучаць сумныя мелодыі Чайкоўскага і Шапэна.

Бесперапынна прыбываюць з вянкамі шматлікія дэлегацыі гарадоў Расійскай Федэрацыі, саюзных рэспублік. Дэлегацыя горада Леніна, узначальваемая сакратаром абласнога і гарадскога камітэтаў ВКП(б) П. С. Папковым, ускладае на труну дванаццаць вянкоў з белых і чырвоных руж. На адной з жалобных лент напісана: «Дарагому Андрэю Аляксандравічу Жданаву — Ленінградскі абласны і гарадскі камітэты ВКП(б)».

Працоўным Ленінграда Андрэй Аляксандравіч Жданаў асабліва дарагі і блізкі. Пасля зладзейскага забойства С. М. Кірава партыя, таварыш Сталін накіравалі яго на пост баявога кіраўніка ленінградскіх большэвікоў, якіх ён яшчэ шчыльней згуртаваў вакол ленінска-сталінскага Цэнтральнага Камітэта большэвіцкай партыі. Тут рабочыя Неўскай заставы неаднаразова выбіралі таварыша Жданава сваім дэпутатам у Вярхоўныя Саветы СССР і РСФСР.

А. А. Жданаў быў з ленінградцамі і ў гады міру і ў гады вайны. Ніколі не забудзе свет гераічную эпапею абароны Ленінграда, якая завяршылася сакрушальным разгромам нямецка-фашысцкіх полчышч, асаджаўшых горад.

Уваходзяць усё новыя і новыя дэлегацыі. У вялізнай залі становіцца цесна ад жывых кветак і вянкоў. Дэлегацыю на чале з сакратаром ЦК КП(б)У тав. Мельнікавым прыслала Совецкая Украіна. Дэлегаты уносяць у залю шматлікія вянкі ад украінскага народа. Ускладаюцца вянкі ад компартыі Беларусі і беларускага народа, ад працоўных Літоўскай, Латвійскай, Эстонскай рэспублік, Грузіі, Арменіі, а таксама Горкаўскай вобласці, дзе таварыш Жданаў на працягу дзесяці год кіраваў партыйнай арганізацыяй. Вялікі вянок ускладаюць калінінцы. У іх горадзе — былой Тверы—16-гадовым юнаком Андрэй Аляксандравіч пачаў сваю рэвалюцыйную дзейнасць. Тут, у рабочых раёнах, ён згуртоўваў большэвіцкія арганізацыі, а пасля перамогі Вялікай Кастрычніцкай социялістычнай рэвалюцыі на працягу двух год узначальваў выканком губернскага Совета.

Група ваенных уносіць вянок з надпісам: «Таварышу, другу, большэвіку А. А. Жданаву ад Булганіна Н. А.».

Сумам аб вялікай утраце ахоплены працоўныя ўсяго свету. Андрэй Аляксандравіч Жданаў быў у першых радах кіраўнікоў міжнароднага рабочага руху. Не шкадуючы сіл і энергіі, ён згуртоўваў сілы дэмакратычнага, антыімперыялістычнага лагеру. Яго імя з вялікай павагай вымаўляе ўсё перадавое чалавецтва.

У Калонную залю заносяцца шматлікія вянкі ад раду ўрадаў краін народнай дэмакратыі, братніх комуністычных партый, рабочых арганізацый, замежных пасольстваў і місій. Вянкі ўскладаюцца ад Клімента Готвальда, Георгія Дзімітрава, Чэхаславацкага ўрада, ЦК Комуністычнай партыі Чэхаславакіі, Чэхаславацкай арміі, Чэхаславацкага пасольства, Славенскай Народнай рады, ад ЦК Польскай рабочай партыі, Польскага пасольства, польскіх прафсаюзаў, ад ЦК Балгарскай рабочай партыі (комуністаў), Балгарскага пасольства, ад урада Румынскай народнай рэспублікі, ад ЦК Румынскай рабочай партыі, ад Венгерскага ўрада, Венгерскага пасольства, ад Албанскага ўрада, ЦК Албанскай компартыі, Албанскай місіі і ад Югаслаўскага пасольства.

Побач з совецкімі воінамі ў ганаровай варце стаяць прадстаўнікі працоўных Польшчы: член Палітбюро ЦК рабочай партыі Польшчы Завадскі, члены ЦК Вітольд, Альбрэхт, намеснік Старшыні Цэнтральнай камісіі профсаюзаў Шчэнсняк, польскі пасол у Маскве Нашкоўскі і ваенны аташэ генерал Венцкоўскі.

Ля труны ў ганаровай варце застылі ваенныя маракі, узначальваемыя віцэ-адміралам Кулаковым. Яны аддаюць апошнюю воінскую почэсць аднаму з віднейшых арганізатараў і будаўнікоў Ваенна-Марскіх Сіл нашай Радзімы. Іх змяняюць старыя большэвікі, дэлегацыі працоўных Татарыі, Тамбоўскай, Мурманскай абласцей... Затым ля труны Андрэя Аляксандравіча Жданава сталі праслаўленыя лётчыкі совецкіх Ваенна-Паветраных Сіл. Сярод іх — Герой Совецкага Саюза генерал-лейтэнант авіяцыі Белякоў, тройчы Герой Совецкага Саюза маёр Кажадуб, двойчы Героі Совецкага Саюза капітаны Сянько, Кунгурцаў і інш.

Марудна, у сумным маўчанні, ідуць працоўныя. Многія з тых, хто прышоў сюды аддаць апошні доўг Андрэю Аляксандравічу, асабіста ведалі яго, працавалі з ім, слухалі яго палымяныя прамовы, кіраваліся яго парадамі — заўсёды яснымі, чоткімі, партыйна-прынцыповымі, звярталіся да яго дапамогі ў вялікіх і малых справах, да якіх таварыш Жданаў адносіўся з нязменнай увагай і чуласцю.

Час прыбліжаецца да пятнаццаці гадзін. Усё часцей і часцей мяняецца ганаровая варта. Ля труны стаяць т. т. А. А. Кузняцоў, М. Ф. Шкіратаў, А. Н. Паскрэбышаў, Б. Н. Чарнаусаў, А. Ф. Горкін, Н. С. Власік, Т. А. Селіванаў. На змену ім становяцца сакратары МГК ВКП(б) І. А. Парфёнаў, Н. П. Фірубін, Н. Н. Данілаў, сакратары МК ВКП(б) С. А. Жолнін, А. Я. Секачоў, О. В. Казлова.

Жалобную вахту нясуць міністры, дэпутаты Вярхоўнага Совета СССР, Героі Социялістычнай Працы, Героі Совецкага Саюза, лаўрэаты Сталінскай прэміі, вядомыя вучоныя, канструктары, народныя артысты, мастакі, настаўнікі, заслужаныя кампазітары і музыканты, пісьменнікі і журналісты, вядомыя стаханаўцы буйнейшых прадпрыемстваў краіны, майстры высокіх ураджаяў.

У ганаровую варту становіцца дэлегацыя працоўных Расійскай Федэрацыі на чале са старшынёй Прэзідыума Вярхоўнага Совета РСФСР І. А. Власавым, Старшынёй Совета Міністраў РСФСР М. І. Радзіонавым. Разам з імі вахту ля труны нясуць Старшыня ВЦСПС В. В. Кузняцоў і сакратар ВЦСПС М. П. Тарасаў.

У 16 гадзін спыняецца доступ у Калонную залю. Ля труны застаюцца члены Камісіі па арганізацыі пахавання, баявыя сябры і таварышы па рабоце, родныя і блізкія нябожчыка. У ганаровай варце — маршалы, адміралы, генералы, афіцэры Совецкай Арміі і Ваенна-Марскога Флота.

... Над прасторамі вуліцы Горкага калышыцца шматлікая колькасць сцягоў, акаймаваных крэпам. Дэлегацыі працоўных накіроўваюцца на Красную плошчу. Усюды над калонамі — партрэты таварыша А. А. Жданава.

... У Калоннай залі наступае глыбокая цішыня. У 17 гадзін 20 хвілін у апошнюю ганаровую варту становяцца таварыш І. В. Сталін, таварышы В. М. Молатаў, Л. П. Берыя, К. Я. Варашылаў, Г. М. Малянкоў, А. І. Мікаян, А. А. Андрэеў, Л. М. Кагановіч, Н. А. Вазнесенскі, А. Н. Касыгін, Н. М. Швернік, А. А. Кузняцоў, М. А. Суслаў, Г. М. Папоў, П. К. Панамарэнка, М. Ф. Шкіратаў, А. Ф. Горкін.

У залі ціха гучыць самотная мелодыя Чайкоўскага.

Таварыш І. В. Сталін разам з кіраўнікамі партыі і ўрада падыходзіць да пастамента. Труну беражліва выносяць з Калоннай залі і ўстанаўляюць на гарматным лафеце.

Пахавальная працэсія рухаецца да Краснай плошчы. Уперадзе амаль на цэлы квартал расцягнулася вялікая калона з вянкамі з жывых кветак. Нясуць на чырвоных падушачках дэпутацкія значкі, ордэны і мядалі, якімі ўдзячная Радзіма адзначыла заслугі выдатнага дзеяча большэвіцкай партыі і Совецкай дзяржавы таварыша Андрэя Аляксандравіча Жданава. Працэсія рухаецца па Ахотнаму раду, міма ганаровага воінскага экскорта, які выстраіўся на Манежнай плошчы, паварачвае ў праезд Гістарычнага музея і ўступае на Красную плошчу.

Красная плошча — ад Гістарычнага музея да храма Васілія Блажэннага — і прылягаючыя вуліцы запоўнены народам. Тут шматлікія дэлегацыі фабрык і заводаў, устаноў і навуковых калектываў сталіцы, калгасаў Маскоўскай вобласці, прадстаўнікі працоўных Ленінграда, Горкага, Калініна, Кіева і іншых гарадоў і абласцей. Роўнымі квадратамі выстраіліся войскі.

Гарматны лафет параўняўся з маўзалеем. Таварыш І. В. Сталін, кіраўнікі партыі і ўрада беражліва здымаюць труну і ўстанаўляюць яе на высокі пастамент.

Красная плошча замірае ў сумным маўчанні. Гучыць жалобная мелодыя...

На трыбуне маўзалея — таварыш І. В. Сталін, таварышы В. М. Молатаў, Л. П. Берыя, К. Я. Варашылаў, Г. Н. Малянкоў, А. А. Андрэеў, А. І. Мікаян, Л. М. Кагановіч, Н. А. Вазнесенскі, Н. М. Швернік, А. Н. Касыгін, А. А. Кузняцоў, М. А. Суслаў, Г. М. Папоў, П. К. Панамарэнка, М. Ф. Шкіратаў, П. С. Папкоў, А. Ф. Горкін, Маршалы Совецкага Саюза Говараў, Будзённы, галоўны Маршал артылерыі Воранаў, Маршал авіяцыі Вяршынін і другія.

Крэмлёўскія куранты б'юць 18 гадзін. Тав. Г. М. Папоў адкрывае жалобны мітынг, прысвечаны памяці члена Палітбюро Цэнтральнага Камітэта Усесаюзнай Комуністычнай партыі большэвікоў, сакратара ЦК ВКП(б), дэпутата Вярхоўнага Совета СССР, генерал-палкоўніка Андрэя Аляксандравіча Жданава. Першае слова гаворыць тав. В. М. Молатаў. Слова прадастаўляецца тав. Г. М. Папову.

Глыбокі жаль працоўных горада Леніна выказаў у сваёй прамове сакратар Ленінградскага абласнога і гарадскога камітэтаў партыі тав. П. С. Папкоў.

Наступнае слова прадастаўляецца маршалу Совецкага Саюза тав. Л. А. Говараву.

... Жалобны мітынг закончаны Таварыш І. В. Сталін, кіраўнікі партыі і ўрада падыходзяць да пастамента, паднімаюць труну і пад гук жалобнага марша нясуць яе да Крэмлёўскай сцяны.

18 гадзін 40 хвілін. Апошняе развітанне. Труну спускаюць у магілу. Раздаецца гарматны салют—апошняя воінская почэсць воіну, змагару, чалавеку, які аддаў усе свае сілы служэнню Радзіме.

Жалобную мелодыю змяняе Дзяржаўны Гімн Совецкага Саюза — магутны жыццесцвярджаючы сімвал бяссмерця вялікай справы, якой прысвяціў сваё жыццё Андрэй Аляксандравіч Жданаў.

На свежавырытай магіле вырастае вялікі бугор з жывых кветак. Сярод іх — вянкі ад ЦК ВКП(б) і Совета Міністраў СССР, Прэзідыума Вярхоўнага Совета СССР, Ленінградскага абкома і гаркома ВКП(б)... У абрамленні вянкоў — партрэт А. А. Жданава. Побач — чырвоныя падушачкі з ордэнамі і мядалямі.

Прыспушчаны над купалам будынка Вярхоўнага Совета СССР Дзяржаўны сцяг Саюза ССР ізноў узвіваецца ўверх.

На трыбуну маўзалея вяртаецца таварыш І. В. Сталін, кіраўнікі партыі і ўрада. Разам з імі падымаюцца маршалы і генералы Совецкай Арміі.

Перад маўзалеем цэраманіяльным маршам праходзяць войскі. Ідуць слухачы ваенных акадэмій і курсанты вучылішч, стралковыя батальёны, праходзіць на лёгкай рысі кавалерыя, за ёй — артылерыя.

Погляды байцоў і працоўных сталіцы звернуты да вялікага Сталіна, пад чыём кіраўніцтвам совецкі народ цвёрдым поступам упэўнена ідзе да новых перамог комунізма.

(ТАСС).

Друг і настаўнік совецкіх пісьменнікаў

Разам з усім совецкім народам беларускія пісьменнікі глыбока смуткуюць з прычыны смерці члена Палітбюро ЦК ВКП(б) і сакратара ЦК, дэпутата Вярхоўнага Совета СССР і БССР — Андрэя Аляксандравіча Жданава.

Жалобны мітынг у Саюзе совецкіх пісьменнікаў БССР адкрыў Пятрусь Броўка.

— Смерць таварыша Жданава—цяжкая страта для ўсяго совецкага народа,—сказаў Піліп Пестрак. — Шмат увагі Андрэй Аляксандравіч аддаваў совецкай літаратуры і мастацтву. Яго нястомная барацьба за высокую ідэйнасць нашай літаратуры, барацьба з праявамі фармалізма і нізкапаклонствам перад буржуазным Захадам натхняла нас, совецкіх пісьменнікаў, на напісанне новых твораў, вартых нашага гераічнага народа.

— Мы ніколі не забудзем,—сказаў Уладзімір Карпаў, — мудрых указанняў Андрэя Аляксандравіча па пытаннях літаратуры і мастацтва. Гэтыя ўказанні былі ўказаннямі нашай партыі. Яны дапамагалі нам глыбей разбірацца ў пытаннях літаратуры, выхоўвалі ў духу адданасці справе комунізма, вучылі непрымірымасці ў барацьбе з усімі шкоднымі праявамі ў літаратуры і мастацтве. Кожнае яго выступленне адкрывала перад намі новыя гарызонты, натхняла на творчую працу. Вобраз таварыша Жданава назаўсёды застанецца ў нашых сэрцах і будзе служыць прыкладам у барацьбе за вялікую справу Леніна—Сталіна.

— Андрэй Аляксандравіч Жданаў быў другам і настаўнікам совецкіх пісьменнікаў,—сказаў Алесь Кучар.—Усе, хто ўдзельнічаў на Першым усесаюзным з'ездзе пісьменнікаў, назаўсёды запомнілі глыбоказмястоўнае выступленне Андрэя Аляксандравіча. Думкі, выказаныя ім, вызначалі новыя шляхі развіцця совецкай літаратуры. Таварыш Жданаў заклікаў нас змагацца за ажыццяўленне ўказанняў таварыша Сталіна аб социялістычным рэалізме, заклікаў нястомна клапаціцца аб развіцці самай перадавой літаратуры ў свеце—літаратуры совецкага народа.

Даклад Андрэя Аляксандравіча аб часопісах «Звязда» і «Ленінград», яго выступленні па пытаннях літаратуры, мастацтва і філасофіі будуць і надалей служыць нам узорам большэвіцкай прынцыповасці і дзяржаўнага падыходу да пытанняў комуністычнага выхавання совецкіх людзей.

Смерць Андрэя Аляксандравіча Жданава, вернага ленінца, саратніка Вялікага Сталіна,—непамерна цяжкая страта не толькі для совецкага народа, але і для ўсяго прагрэсіўнага чалавецтва.

Жалобны мітынг

Жалобны мітынг мастакоў з прычыны смерці т. Жданава адкрыў народны мастак БССР, лаўрэат Сталінскай прэміі З. Азгур.

З прамовамі на мітынгу выступілі старшыня Праўлення Саюза совецкіх мастакоў БССР Я. Зайцаў, І. Ахрэмчык, М. Керзін і другія.

— Мне давялося,—гаворыць тав. Зайцаў, — слухаць выступленне Андрэя Аляксандравіча Жданава ў Ленінградзе. Вялікае ўражанне зрабіла на мяне глыбіня думкі, сіла тэарэтычных абагульненняў, разуменне ўсіх надзённых задач совецкай навукі і мастацтва, любоў і клопаты таварыша Жданава аб развіцці духоўнай культуры нашага народа.

Смерць таварыша Жданава—надзвычай цяжкая страта.

Совецкія мастакі будуць заўсёды памятаць усе ўказанні нашага любімага Андрэя Аляксандравіча па пытаннях літаратуры і мастацтва і будуць няўхільна змагацца за ператварэнне іх у жыццё.

— Цяжка знайсці словы, каб выказаць той смутак, які перажываем мы, совецкія мастакі, даведаўшыся аб смерці вернага сына большэвіцкай партыі і совецкага народа, нястомнага змагара за пабудову комуністычнага грамадства—Андрэя Аляксандравіча Жданава, — гаворыць М. Керзін.—Гэта быў выдатны тэарэтык ленінска-сталінскага тыпу. Сваімі глыбока-змястоўнымі выступленнямі ён заўсёды ўносіў яснасць ва ўсе спрэчныя пытанні літаратуры і мастацтва, вучыў нас нястомнай барацьбе супроць усяго варожага нашай ідэалогіі, дапамагаў нам ствараць мастацкія творы, вартыя сталінскай эпохі і нашага гераічнага народа.

Вялікае значэнне мелі выступленні і тэарэтычныя работы таварыша Жданава ў выхаванні совецкага народа ў духу адданасці большэвіцкай партыі, таварышу Сталіну і вялікай справе пабудовы комуністычнага грамадства.

Усе выступаўшыя на мітынгу заклікалі совецкіх мастакоў няўхільна змагацца за ажыццяўленне ўсіх указанняў Андрэя Аляксандравіча Жданава ў сваёй практычнай дзейнасці.

Вобраз любімага таварыша Жданава назаўсёды застанецца ў сэрцы совецкага народа і будзе служыць прыкладам адданага служэння інтарэсам народа, інтарэсам социялістычнай бацькаўшчыны.

Змагар за шчасце народа

Пачуццё вялікага смутку і гора балюча кранула сэрцы работнікаў кіностудыі «Беларусьфільм». Адбыўся жалобны мітынг.

— Не стала лепшага сына нашай большэвіцкай партыі,—гаворыць сакратар партыйнага бюро тав. Бяляеў.—Не стала палымянага трыбуна рэволюцыі, чыё імя вечна будзе жыць у нашых сэрцах, як імя крыштальнага большэвіка.

— З імем Андрэя Аляксандравіча Жданава звязаны многія старонкі нашага вялікага социялістычнага будаўніцтва і барацьбы з ворагамі,—зазначае рэжысёр тав. Любошыц.—Палымяны змагар за высокія духоўныя якасці нашых людзей, барацьбіт за партыйнасць нашай літаратуры і мастацтва—такім мы ведалі таварыша Жданава, такім ён застанецца ў нашай памяці назаўсёды.

У сваім выступленні кіноапяратар тав. Вейняровіч сказаў:

— Увесь наш народ з вялікім болем і смуткам сустракае цяжкую вестку аб смерці Андрэя Аляксандравіча Жданава. На вопыце яго жыцця мы павінны вучыцца, як жыць і змагацца за шчасце народа.

Настаўнік совецкай моладзі

З глыбокім смуткам слухалі студэнты Беларускага Дзяржаўнага Універсітэта вестку аб смерці выдатнага дзеяча большэвіцкай партыі і совецкай дзяржавы А. А. Жданава.

У вялікай залі біялагічнага корпуса адбыўся жалобны мітынг, на які сабраліся студэнты і выкладчыкі Універсітэта.

— Бязлітасная смерць вырвала з нашых радоў аднаго з нястомных змагароў за пабудову комунізма,—сказаў дэкан гістарычнага факультэта Ф. Нячай, адкрываючы жалобны мітынг.—Настойліва прапагандуючы ідэі ленінізма, Андрэй Аляксандравіч Жданаў, як тэарэтык большэвіцкай партыі і дзеяч совецкай дзяржавы, арганізоўваў наш народ для далейшых перамог па шляху да светлай будучыні.

— Смерць Андрэя Аляксандравіча Жданава—асабліва цяжкая страта для нас, работнікаў ідэалагічнага фронта, бо кожнае выступленне А. А. Жданава заўсёды было нам праграмай дзеянняў, — зазначыў прарэктар па навуковай частцы, доктар гістарычных навук А. П'янкоў.

Дацэнты М. Мельцар і Ф. Дамінікоўскі, студэнты В. Чапко, І. Бабушкін, Ю. Суораў, І. Гарлачоў гаварылі аб цяжкай страце, якую панесла наша маладое пакаленне ў сувязі са смерцю друга і настаўніка совецкай моладзі—А. А. Жданава.

Студэнты запэўнілі совецкі ўрад, большэвіцкую партыю і Вялікага Сталіна, што выдатнай вучобай яны дакажуць сваю адданасць ленінска-сталінскім ідэям, таленавітым і нястомным прапагандыстам якіх быў А. А. Жданаў.

Нястомны барацьбіт за комунізм

Вострым болем адклікнулася ў сэрцы кожнага з нас і ў сэрцы ўсяго нашага народа балесная вестка аб смерці аднаго з самых лепшых сыноў вялікай совецкай зямлі і нашай большэвіцкай партыі. Цяжка паверыць, што перастала біцца вялікае, чулае і гарачае сэрца аднаго з бліжэйшых спадвіжнікаў нашага правадыра і настаўніка таварыша Сталіна. Горка ўсведамляць, што скончыўся жыццёвы шлях Андрэя Аляксандравіча Жданава і скончыўся ў самым росквіце яго вялікіх маральных і творчых сіл.

Схіляючы галовы над прахам дарагога ўсім нам і незабыўнага Андрэя Аляксандравіча, мы назаўсёды захаваем у сваім сэрцы светлую памяць аб нястомным барацьбіту за комунізм, за шчасце чалавецтва, за прагрэс. Ясны вобраз Андрэя Аляксандравіча будзе для нас прыкладам таго, як трэба працаваць і служыць на шчасце народу, як трэба змагацца за ажыццяўленне вялікіх ідэй Леніна—Сталіна, за светлую долю ўсяго чалавецтва.

Вечная памяць выдатнейшаму сыну нашай партыі і нашага вялікага Совецкага народа.

ЯКУБ КОЛАС.

ЦЯЖКАЯ СТРАТА

Адбыўся жалобны мітынг у Мінскай кансерваторыі і Музычным вучылішчы. Пры адкрыцці мітынгу прафесары М. Аладаў і М. Бергер выканалі на фартап'яна жалобны марш Бятховена.

— Таварышы,—сказаў прафесар А. Амітон,—памёр буйнейшы дзеяч нашай партыі, верны саратнік таварыша Сталіна— Андрэй Аляксандравіч Жданаў. Гэта надзвычай цяжкая страта. Імя тав. Жданава было адным з папулярнейшых імён у нашай краіне. У нашых сэрцах назаўсёды застанецца вобраз А. А. Жданава, які ўсё сваё жыццё аддаў будаўніцтву новага социялістычнага грамадства. Найлепшым ушанаваннем яго памяці будзе наша сумленная праца на карысць той справы, якой аддаў сваё жыццё Андрэй Аляксандравіч Жданаў.

Пачуццямі глыбокага жалю былі прасякнуты выступленні дацэнта Л. Харыка, заслужанага артыста БССР І. Жыновіча, дэпутата Варашылаўскага райсовета — настаўніцы Е. Акулавай.

ДРУГ СОВЕЦКІХ ВУЧОНЫХ

Совецкія вучоныя, як і ўвесь совецкі народ, глыбока смуткуюць аб выключна цяжкай страце. Смерць вырвала з нашых радоў лепшага сына совецкага народа і большэвіцкай партыі, саратніка і друга Вялікага Сталіна. Совецкія вучоныя вечна будуць помніць і высока шанаваць светлы вобраз дарагога Андрэя Аляксандравіча Жданава, творы якога ўвайшлі залатым фондам у скарбніцу нашай перадавой совецкай навукі. Цяжка паверыць, што спынілася сэрца выдатнага і горача любімага ўсім совецкім народам барацьбіта за ідэйную чыстату нашай навукі, нашага мастацтва, барацьбіта за мір, за шчасце ўсяго перадавога чалавецтва.

Светлы вобраз Андрэя Аляксандравіча вечна будзе жыць у нашых сэрцах.

Над труной Андрэя Аляксандравіча мы клянемся, што яшчэ цясней згуртуем свае рады вакол большэвіцкай партыі і любімага Сталіна, мабілізуем ўсе свае сілы і веды на далейшы ўздым нашай совецкай навукі і росквіт любімай Радзімы.

І. С. ЛУПІНОВІЧ,
Віцэ-прэзідэнт Акадэміі навук БССР, сапраўдны член Акадэміі навук БССР.

ВОІН КОМУНІЗМА

З глыбокім смуткам сустрэлі работнікі Камітэта па справах культасветустаноў пры Совеце Міністраў БССР вестку аб смерці выдатнага дзеяча большэвіцкай партыі Андрэя Аляксандравіча Жданава.

Жалобны мітынг адкрыў тав. Ф. Кукушкін.

— Я мела шчасце, — гаворыць начальнік бібліятэчнага аддзела Камітэта тав. Леліна, — неаднаразова слухаць выступленні Андрэя Аляксандравіча. Ён быў шчырым і чулым таварышам, заўсёды клапаціўся аб інтарэсах працоўных.

— Няма дарагога і любімага Андрэя Аляксандравіча Жданава,—гаворыць Б. Пяркоўскі, — але справа яго жыве. Яго светлы вобраз будзе заўсёды натхняць совецкіх людзей і клікаць іх змагацца за пабудову комунізма ў нашай краіне.

Выдатны дзеяч большэвіцкай партыі

Большэвіцкая партыя і совецкі народ страцілі аднаго з лепшых сваіх сыноў, бліжэйшага саратніка Вялікага Сталіна—Андрэя Аляксандравіча Жданава.

Таварыш Жданаў нястомна клапаціўся аб развіцці совецкай навукі, літаратуры і мастацтва. Яго кіпучая дзейнасць была накіравана на ўмацаванне нашага ідэалагічнага фронта, на выкараненне рэштак фармалізма ў літаратуры і мастацтве, на барацьбу з нізкапаклонствам перад буржуазным Захадам. Усе ўказанні Андрэя Аляксандравіча садзейнічалі ўмацаванню магутнасці Совецкага Саюза, росту духоўнай культуры Совецкага народа, дапамагалі выхаванню працоўных у комуністычным духу.

Перад совецкімі мастакамі, як і перад другімі работнікамі ідэалагічнага фронта, стаіць задача—да канца ажыццявіць усе ўказанні тав. Жданава ў сваёй практычнай дзейнасці. Мы павінны прыкласці ўсе намаганні, каб увасобіць у мастацтве вобраз выдатнага дзеяча Комуністычнай партыі, якім быў Андрэй Аляксандравіч Жданаў.

ЗАІР АЗГУР,
лаўрэат Сталінскай прэміі, народны мастак БССР.

ВЯЛІКІ ГРАМАДЗЯНІН

Жалобны мітынг студэнтаў і выкладчыкаў Мінскага тэатральнага інстытута адкрыў сакратар партыйнай арганізацыі А. Бутакоў.

— Радыё прынесла нам смутную вестку,—сказаў прафесар Я. Міровіч,—памёр вялікі чалавек. Няма слоў, каб выказаць той глыбокі жаль, які ахапіў сэрцы совецкіх людзей. Таварыш Жданаў быў буйнейшым тэарэтыкам марксізма-ленінізма, нястомна клапаціўся, каб наша совецкая навука, літаратура і мастацтва былі самымі перадавымі ў свеце. Светлы вобраз Андрэя Аляксандравіча Жданава заўсёды будзе ў сэрцы кожнага совецкага чалавека.

У сваім выступленні студэнт-выдатнік Інстытута тав. Е. Сянкевіч сказаў:

— Андрэй Аляксандравіч аддаў усё сваё жыццё росквіту нашай краіны, будаўніцтву социялістычнага грамадства. Вялікая справа, за якую змагаўся любімы таварыш Жданаў, абавязвае нас аддаць усе свае сілы і здольнасці на служэнне народу.

Любімец совецкага народа

Памёр вялікі дзеяч большэвіцкай партыі Андрэй Аляксандравіч Жданаў. Совецкі народ і партыя ў асобе таварыша Жданава панеслі вялікую страту.

Таварыш Жданаў карыстаўся выключнай любоўю сярод совецкага народа—рабочых, калгаснікаў, інтэлігенцыі. Яго даклады, прысвечаныя пытанням філасофіі, літаратуры і мастацтва, па сваёй глыбіні, прастаце і мудрасці з'яўляюцца ўзорам яснай большэвіцкай думкі, крыніцай натхнення ў нашай штодзённай працы на ідэалагічным фронце.

Таварыш Жданаў памёр, але яго вобраз будзе жыць у нашых сэрцах, яго думкі будуць натхняць нас на служэнне народу, на стварэнне сапраўднай народнай літаратуры.

ПІЛІП ПЕСТРАК.

Сусветны кангрэс дзеячоў культуры

З 25 па 28 жніўня ў горадзе Вроцлаў, у залі Палітэхнічнага інстытута, адбываўся Сусветны кангрэс дзеячоў культуры ў абарону міру. На кангрэс былі запрошаны дэлегаты 46 краін свету.

Кангрэс адкрыў польскі пісьменнік Яраслаў Івашкевіч.

Пасля абрання старшынь і намеснікаў старшынь аб'яўляецца парадак дня кангрэса, у які былі ўключаны наступныя пытанні: 1. Навука і культура ў барацьбе за мір, прагрэс і дэмакратыю (А. Фадзееў); 2. Мір і культура (Олаф Ф. Стапльтон); 3. Аб свабодзе нацыянальных культур (Іосіф Халасінскі); 4. Міжнароднае культурнае супрацоўніцтва (Марсель Прэнан).

Слова прадастаўляецца міністру замежных спраў Польскай рэспублікі Мадзялеўскаму. Мадзялеўскі адзначае, што сучасная дэмакратычная Польшча, яе народ і ўрад заўсёды гатовы падтрымаць мерапрыемствы, накіраваныя да абароны міру і барацьбы супроць імперыялістычных падпальшчыкаў новай вайны.

Затым з дакладам выступіў А. Фадзееў. Ён перадаў ад імя дэлегацыі СССР братняе прывітанне перадавой польскай інтэлігенцыі і падзяку ўраду і народу Польшчы за гасціннасць.

— Пасля другой сусветнай вайны, — зазначыў у сваім дакладзе А. Фадзееў, — ва ўсім свеце вызначыліся два лагеры: лагер дэмакратычны, антыфашысцкі, антыімперыялістычны на чале з Совецкім Саюзам і лагер антыдэмакратычны, рэакцыйны, імперыялістычны, які ўзначальваюць кіруючыя колы ЗША.

Дэмакратычны лагер на чале з СССР бачыць сваю галоўную задачу ў тым, каб забяспечыць для чалавецтва трывалы, справядлівы мір. А. Фадзееў зазначыў, што рэакцыянеры выкарыстоўваюць для барацьбы супроць прагрэсіўнай ідэалогіі ўсялякія меры, аж да прымянення гвалту.

Спробы гвалтоўнага выкаранення перадавой культуры, якія нагадваюць гітлераўскую практыку, прадстаўляюць адзін бок справы. Побач з імі праводзіцца нястрымная ідэалагічная экспансія амерыканскага капітала. Прапагандуецца сусветнае панаванне амерыканскіх манапалістаў, мілітарызм, новая імперыялістычная вайна, накіраваная ў першую чаргу супроць Совецкага Саюза. Прапаганда новай вайны спалучаецца з пропаведдзю расізма і расавай дыскрымінацыі.

Будучыня культуры залежыць ад таго, наколькі цесна будуць звязаны майстры культуры з народам, які змагаецца за свабоду і незалежнасць. Актыўнае, мужнае супраціўленне прагрэсіўнай думкі ўсім формам рэакцыі—такая задача ўсіх інтэлігентаў, прыяцеляў міру і прагрэсу.

Дакладчык указаў на заганнасць пазіцыі асобных вучоных, літаратараў, мастакоў, якія лічаць, што ім удасца захаваць сваю «незалежнасць», калі яны замкнуцца ў сваім габінеце або лабараторыі, калі яны будуць трымацца ў баку ад грамадскага жыцця. Абарона культуры, барацьба за мір і дэмакратыю — агульная справа народаў усяго зямнога шару.

А. Фадзееў зазначыў, што на працягу трох дзесяцігоддзяў свайго існавання Совецкі Саюз нязменна выступаў абаронцай міру і культуры, абаронцай незалежнасці і свабоды народаў. Няма нічога дзіўнага ў тым, што да СССР звернуты позіркі перадавых дзеячоў усяго свету, якія разглядаюць краіну соцыялізма як увасабленне сіл сусветнай культуры.

А. Фадзееў заклікаў прысутных ісці наперад на барацьбу супроць рэакцыі за мір, свабоду і шчасце народаў, за свабоду і шчасце чалавецтва.

Даклад А. Фадзеева неаднаразова перапыняўся бурнымі апладысментамі дэлегатаў кангрэса.

Затым выступілі з дакладамі: «Мір і культура»—англійскі пісьменнік і філосаф Олаф Ф. Стапльтон, «Аб свабодзе нацыянальных культур» — прафесар Лодзінскага універсітэта Іосіф Халасінскі, «Міжнароднае культурнае супрацоўніцтва»—французскі вучоны, прафесар Марсель Прэнан.

Прысутныя цёпла сустрэлі выступленне Ільі Эрэнбурга, які зазначыў, што адной з важнейшых задач перадавой інтэлігенцыі з'яўляецца выкрыццё людзей, якія, рыхтуючыся да варварскай вайны, гавораць аб абароне заходняй культуры.

Прамова прафесара Оксфордскага універсітэта Тойлара, у якой ён усяляк усхваляў «план Маршала», выклікала ўсеагульнае абурэнне.

У далейшых выступленнях дэлегаты кангрэса далі належны адпор Тойлару.

У спрэчках выступілі Д. Заслаўскі, С. Вургун, дэлегаты ЗША, Балгарыі, Чэхаславакіі, Аўстрыі, дэмакратычнай грамадскасці Германіі, рэспубліканскай Іспаніі і іншых краін,—усяго каля 50 дэлегатаў.

Пасля спрэчак кангрэс дзеячоў абмеркаваў і пад бурныя апладысменты прыняў Маніфест.

Сусветны кангрэс дзеячоў культуры ў абарону міру стварыў Міжнародны камітэт сувязі, месцазнаходжанне камітэта Парыж.

У камітэт увайшлі ад СССР А. Фадзееў і П. Федасееў, Поль Робсан (ЗША), Говард Фаст (ЗША), Альберт Кан (ЗША), Пабло Няруда (Чылі), Луі Арагон (Францыя), Жаліо-Кюры (Францыя), Хіраль (рэспубліканская Іспанія), Дэмбоўскі і Барэйша (Польшча).

28 жніўня ў Вроцлаве адбыўся 30-тысячны мітынг працоўных, прысвечаны Сусветнаму кангрэсу дзеячоў культуры ў абарону міру. На мітынгу выступілі совецкі дэлегат Л. Ляонаў, М. Андэрсен-Нексе (Данія), ад рэспубліканскай Іспаніі Дэ Кастро, настаяцель Кентэрбярыйскага сабора Джонсан і другія.

Прамоўцы заклікалі працоўных пільна ахоўваць мір, дэмакратыю і свабоду.

ДАСЯГНУТАЕ і НЕАБХОДНАЕ

★ ★ ★

(Часопіс „Беларусь“ № 1 — 7 за 1948 г.)

★ ★ ★

ЦК КП(б)Б у мінулым годзе пісаў ў сваёй пастанове: «Часопіс «Беларусь», як масава-літаратурна-мастацкі і грамадска - палітычны ілюстраваны часопіс, павінен адгукацца на ўсе важнейшыя сучасныя падзеі жыцця беларускага народа, сродкамі мастацкага слова паказваць працоўныя подзвігі совецкіх людзей па выкананню сталінскай пяцігодкі, расказваць аб дасягненнях культуры, навукі, мастацтва ў БССР, а таксама распаўсюджваць навуковыя веды па гісторыі беларускага народа, аб яго жыцці ў совецкім грамадстве. У часопісу асноўнае месца павінны займаць апавяданні, вершы, нарысы, масавыя песні, сатырычныя фельетоны, аднаактныя п'есы, навукова-папулярныя лекцыі, бібліяграфічныя нататкі на ўсю выходзячую ў БССР літаратуру». Прайшло больш года з часу надрукавання гэтай пастановы, і цяпер ёсць мажлівасць і неабходнасць паглядзець, як часопіс «Беларусь» выконвае ўказанні партыі, наколькі ён спраўляецца са сваімі абавязкамі.

1.

Раздзел прозы з'яўляецца, як звычайна, адным з асноўных, вядучых раздзелаў літаратурна - мастацкага часопіса.

Безумоўна, вельмі добра, што рэдакцыя асноўнае месца адводзіць апавяданням на тэму сённяшняга жыцця нашай краіны. Надзвычай змястоўная наша сучаснасць павінна быць як мага паўней і глыбей адлюстравана ў творах пісьменнікаў. Але гэта нікольки не значыць, што часопіс можа друкаваць бездапаможныя ў мастацкіх адносінах творы, як апавяданне К. Папкоўскага «Пасля навальніцы», фальшывы, надуманы твор, напісаны з нейкім хваравітым надрывам.

Мала лепшае і другое апавяданне К. Папкоўскага—«Жаданы госць».

М. Даніленка ў апавяданні «Суседзі» знаходзіцца ў палоне штампа, традыцыі. У апавяданні, не гледзячы на «абноўленую» сюжэтную канву, фігурыруе ўсё тая-ж спрадвечная гнілая грэбля паміж двума вёскамі. На гэтай грэблі па-ранейшаму коні ломяць ногі, яе аб'язджаюць за сем кілометраў, але ніхто з суседзяў не збярэцца яе наладзіць. Па той-жа традыцыі, моладзь бярэ на сябе ініцыятыву і рамантуе дарогу. Праўда, у М. Даніленкі цяжка зразумець, калі адбываюцца гэтыя справы: у адным месцы твора ён піша, што пасля вайны, у другім—да калгасаў.

Лепшым з надрукаваных у «Беларусі» ў гэтым годзе апавяданняў нам здаецца апавяданне І. Грамовіча «Вяселле ў Загор'і». Заслугоўвае, перш за ўсё, пахвалы тое, што І. Грамовіч тэмай для свайго твора выбраў калектывізацыю вёскі ў заходніх абласцях Беларусі.

Сюжэтна вельмі простае, апавяданне цікавае пераканаўчымі псіхалагічнымі характарыстыкамі, дадзенымі пісьменнікам галоўным дзеючым асобам. І. Грамовіч здолеў зазірнуць у душу сваіх герояў, паказаў складаную ўнутраную барацьбу, якая адбываецца ў юнака-аднаасобніка Уладзіка, закаханага ў калгасніцу Міхаліну з суседняга калгаса. Радуе тое, што аўтар не пайшоў па працярэбленай сцежцы (да таго-ж — здрадлівай) і не паказаў каханне да дзяўчыны, як прычыну перавыхавання героя і ліквідацыю ў ім прыватнаўласніцкіх настрояў. Жыццё бацькі-аднаасобніка ў параўнанні з жыццём калгаснікаў, размовы з Лугенам—брыгадзірам трактарнай брыгады, роздум над будучым былі той глебай, на якой узышла новая свядомасць Уладзіка. Праўдзіва паказвае пісьменнік, як і ў сэрцы заядлага прыватнаўласніка старога Антона Домуця, бацькі Уладзіка, пасля наведання ім вяселля сына ў калгасе лопнула аднаасобніцкая струна, і хоць у канцы апавядання ён яшчэ стаіць на раздарожжы, але чытач упэўнены, што ў свядомасці героя наспявае пералом, які прывядзе яго ў калгасную сям'ю.

Твор напісаны прыгожай мовай, у ім нярэдка сустракаюцца свежыя, трапныя мастацкія дэталі.

Апавяданне «Вяселле ў Загор'і»—несумненная ўдача І. Грамовіча.

З астатніх апавяданняў вылучаюцца таксама «Канец лягенды» А. Міронава. Аўтар удала спалучыў лягенду, расказаную старым лесніком, з жывой рэчаіснасцю.

Апошні час рэдакцыя шмат увагі аддае нарысам і кароткім нататкам пра герояў працы, наватараў сельскай гаспадаркі і прамысловасці, пра герояў аднаўлення. Але ці могуць задаволіць чытача змешчаныя часопісам мастацкія нарысы? — На жаль, пакуль што не могуць. Іх далёка не заўсёды можна назваць мастацкімі. Вельмі часта нарысы нагадваюць звычайныя газетныя допісы, простыя рэпарцёрскія замалёўкі. Таму не дзіўна, што, прачытаўшы ўсе нарысы адразу, цяжка сказаць, які-ж з іх лепшы, які горшы. Аўтары імкнуцца абавязкова апісаць як мага больш людзей, прыводзяць у пацверджанне сваіх довадаў мноства лічбаў і... усё-ткі слізгаюць па паверхні. У чым сакрэт майстроўхлебаробаў—з нарысаў для чытача не вынікае. Падкормка ўзыходаў, знішчэнне коркі на глебе, праполка ад пустазелля—паўтараюць усе нарыснікі. А сапраўднай барацьбы за ўраджай—штодзённай, клапатлівай, цяжкой, складанай — у нарысах бачна мала. Спрошчанасць, павярхоўнасць пры апісанні працэсаў, некаторая лакіроўка рэчаіснасці, адсутнасць жывых вобразаў, якія-б запаміналіся, вельмі невыразная мова характэрны для большасці мастацкіх нарысаў, змешчаных у часопісу (некалькі выключэнням з'яўляюцца: «Людзі з «Дальняй фермы» В. Гільбурда, «Героі працы» Т. Хадкевіча, «Гаспадары» М. Пенкрата).

2.

Паэзія ў «Беларусі» прадстаўлена даволі багата. Гэта бадай што самы моцны раздзел часопіса. З нумара ў нумар рэдакцыя друкуе новыя вершы. Прыемна адзначыць, што пераважная большасць вершаў тэматычна прысвечана пасляваеннаму аднаўленню горада і вёскі, росквіту шчаслівага жыцця совецкага чалавека, які здабыў мір і смела крочыць у сонечную будучыню. На гэтую тэму напісаны цудоўныя вершы лаўрэата Сталінскай прэміі Максіма Танка—«Дружба», «Добрай раніцы», «Над Прыпяццю», «Мандарыны», вершы К. Кірэенкі—«Горнае світанне», «Альпініст на вяршыні», «Песня», «Стэп», М. Лужаніна — «Маладыя майстры», А. Вялюгіна—«Шахцёр і сейбіт», Э. Агняцвет — «Я нарадзілася ў Мінску», А. Астапенкі—«Гвардзейскі значок» і іншыя.

Станоўчым у рабоце рэдакцыі з'яўляецца выхаванне пачынаючых і маладых паэтаў. Часопіс змясціў нядрэнныя вершы: І. Цімашкова — «Садоўнік», І. Юрчанкі—«Палескі дуб», А. Пысіна—«Плыты». Праўда, для сямі нумароў гэтага, бясспрэчна, вельмі і вельмі мала, і працаваць з літаратурнай моладдзю рэдакцыя фактычна толькі пачынае.

Ёсць падставы папракнуць рэдакцыю ў слабай патрабавальнасці да друкуемага паэтычнага матэрыяла, у выніку чаго ў часопісу побач з добрымі вершамі змяшчаюцца часам слабыя, недапрацаваныя (верш М. Калачынскага «Бабёр»).

З буйных паэтычных твораў у часопісу (№ 6) надрукавана новая паэма Петруся Броўкі «Родныя берагі».

Выкарыстоўваючы сюжэт, які стаў ужо традыцыйным—пісьменнік ідзе ўслед за героем, што падарожнічае па раёну, і дае беглыя замалёўкі бачанага,—аўтар пазбавіў сябе магчымасці паказаць больш-менш поўна саміх стваральнікаў калгасных багацяў, і ў творы яны толькі названы.

3.

У свой час ЦК ВКП(б) у спецыяльнай пастанове звярнуў сур'ёзную ўвагу на тое, што крытыка і бібліяграфія вельмі адстаюць ад жыцця, што гэтая важная зброя комуністычнага выхавання і прапаганды забыта. Было прапанавана адкрыць у літаратурна-мастацкіх часопісах раздзелы крытыкі і бібліяграфіі і звярнуць на іх належную ўвагу.

Ацэньваючы работу крытычнага і бібліяграфічнага раздзела часопіса «Беларусь», прыходзіцца прызнаць, што рэдакцыя не зрабіла для сябе адпаведных вывадаў з гэтай пастановы. Асаблівую трывогу выклікае становішча з раздзелам крытыкі. Аб існаванні яго іншы раз проста ніжка меркаваць, бо некаторыя нумары выходзяць без крытычных і літаратуразнаўчых артыкулаў. Вельмі мала друкуецца работ аб лепшых творах нашай літаратуры, аб творчасці пісьменнікаў, артыкулаў аб гісторыі беларускай літаратуры, тэарэтычна-праблемных артыкулаў.

Бібліяграфія ў часопісу ўсё яшчэ ў асноўным носіць тлумачальна-каментатарскі характар. Глыбокі аналіз твораў таго ці іншага пісьменніка часта падмяняецца пераказам зместу твора. Заўвагі пісьменніку, крытыка слабых бакоў рэцэнзіруемых кніг робяцца вельмі асцярожна, баючыся пакрыўдзіць аўтара.

Бібліяграфічнаму разгляду ў часопісу падлягаюць чамусьці толькі кнігі маладых і пачынаючых аўтараў. Рэдакцыя не змясціла ні адной рэцэнзіі на кнігі з Кастрычніцкай серыі, выбраных твораў беларускай літаратуры, у часопісу не сустрэнеце артыкула аб творах лаўрэатаў Сталінскай прэміі, рэдакцыя не друкуе, як гэтага патрабаваў ЦК КП(б)Б, «бібліяграфічныя нататкі на ўсю выходзячую ў БССР літаратуру».

* * *

Агляд раздзелаў часопіса «Беларусь» дае падставу зрабіць вывад, што рэдакцыя марудна перабудоўваецца, што ў яе рабоце яшчэ ёсць шмат сур'ёзных недахопаў. На старонках часопіса адсутнічаюць творчыя дыскусіі, вострая прынцыповая палеміка. Часопіс не друкуе артыкулаў, якія выкрываюць гнілую культуру капіталістычных краін, артыкулаў аб барацьбе з нізкапаклонствам перад іншаземшчынай, аб барацьбе з касмапалітызмам. Забыты ў «Беларусі» мастацтва, тэатр; мастацтвазнаўчы артыкул або рэцэнзія на спяктакль—у часопісу вялікая рэдкасць.

Рэдакцыя павінна перабудаваць сваю работу, інакш часопіс «Беларусь» адстане ад жыцця.

Ів. КУДРАЎЦАЎ.

На радзіме вялікага Глінкі

Беларускі Дзяржаўны ордэна Леніна тэатр оперы і балета закончыў свае гастролі ў Смаленску.

З асаблівым хваляваннем чакалі мы сустрэчы з жыхарамі горада, які ўпісаў не адну слаўную старонку ў гісторыю нашай Радзімы. Тут, на радзіме Пржэвальскага, Нахімава, Дакучаева і генія рускай музыкі Глінкі, нам выпала чэсць паказаць нашую працу.

Ужо з першага спяктакля «Яўгені Анегін» мы адчулі тыя ніці сімпатыі, якія звязвалі нас з глядзельнай заляй на працягу гастроляў тэатра. Асаблівы поспех выпаў на долю народнай артысткі БССР Р. Млодэк (Таціяна), заслуж. арт. Н. Сярдобава (Анегін), народнага артыста БССР І. Балоціна (Ленскі) і артыста Таланкіна (Грэмін).

Наступныя спяктаклі — «Травіята», «Рыгалета», «Чыа-чыа-сан» ішлі з такім-жа поспехам.

Вялікім поспехам карыстаўся балет «Лебядзіное возера», які ўпершыню ішоў у Смаленску.

З поспехам прайшоў заключны канцэрт майстроў тэатра пры ўдзеле лаўрэата Сталінскай прэміі, народнай артысткі СССР Л. Александроўскай.

Прыезд тэатра оперы і балета ў Смаленск перайшоў межы звычайнай гастрольнай паездкі і выліўся ў яркую дэманстрацыю сталінскай дружбы народаў.

У знак сваёй глыбокай пашаны да генія рускай музыкі М. Глінкі тэатр усклаў вянок на помнік вялікага кампазітара, якому яго землякі паставілі гэты манумент з кароткім, але красамоўным надпісам «Расія—М. І. Глінку». У час ускладання вянка перад помнікам сабраўся многатысячны натоўп жыхароў горада; потым у парку быў дадзены канцэрт з твораў Глінкі. Перад мікрафонам ад імя тэатра выступіў заслужаны артыст БССР В. Шахрай з кароткім словам аб значэнні Глінкі—стваральніку рускай музычнай культуры, на чыёй творчасці выхоўваюцца пакаленні совецкіх музыкантаў і ў тым ліку і беларускіх. З прамовамі выступілі прадстаўнікі мясцовай музычнай грамадскасці. У канцэрце, на якім прысутнічала 5000 слухачоў, прынялі ўдзел народная артыстка БССР Р. Млодэк, арт. Таланкін, хор і аркестр тэатра пад кіраўніцтвам дырыжора Гіттарца. Былі выкананы ўрыўкі з «Руслана і Людмілы», «Івана Сусаніна», а таксама «Камарынская».

Вопыт гэтай паездкі паказаў, што тэатру неабходна часцей практыкаваць гастрольныя выезды.

Наш поспех у Смаленску, цёплая сустрэча з гледачамі ўмацавалі ў нас бадзёрасць і ўпэўненасць у тым, што вялікія творчыя задачы, якія стаяць перад нашым калектывам напярэдадні трыццацігоддзя БССР, будуць паспяхова вырашаны.

г. Смаленск.

(Наш кар.).

„За нашу Совецкую Радзіму“

Выдавецтва ЦК ВЛКСМ «Маладая гвардыя» падрыхтавала да друку зборнік «За нашу Совецкую Радзіму», прысвечаны слаўным сынам і дачкам ленінскага комсамола. У чорныя дні нямецкай акупацыі адважныя комсамольцы Беларусі і Украіны, Кубані і Крыма пайшлі ў падполле. Пад мудрым кіраўніцтвам партыі большэвікоў вялі яны жорсткія сутычкі з каварным ворагам.

Аб гэтых дзеяннях мужных і бясстрашных партызан і партызанак, баявых памочніках большэвікоў-падпольшчыкаў апавядае зборнік «За нашу Совецкую Радзіму».

Вялікі раздзел у зборніку прысвечан гісторыі комсамольскага падполля ў Мінску ў дні Айчыннай вайны. Аўтар яго—С. Разанаў расказвае аб бязмежнай мужнасці і адвазе мінскіх комсамольцаў Нікалаю Кедышка, Валі Дамброўскай і Надзі Кедышка і многіх другіх верных патрыётах Радзімы.

Масква. (Наш кар.).

Агітбрыгады—у калгасах

У час уборачнай кампаніі і здачы збожжанарыхтовак дзяржаве агітбрыгада Ашмянскага раённага Дома культуры наведала калгас «17 верасня», а таксама вёскі Маствіліскага, Куцэвіцкага, Гальшанскага сельсоветаў і арганізавала канцэртныя выступленні.

Пры Кушлянскай хаце-чытальні, Смаргоньскага раёна, наладжана работа гурткоў мастацкай самадзейнасці—драматычнага, харавога, танцавальнага і іншых.

Удзельнікі мастацкай самадзейнасці арганізавалі агітбрыгаду ў складзе 15 чалавек. Гэта брыгада выступіла з канцэртамі ў калгасе імя Сталіна і ў вёсках Горцы, Стрыпуні, Несцяляты. У праграме канцэртаў—песні совецкіх кампазітараў: Кантата аб Сталіне, «Бывайце здаровы», «Мы—беларусы» і іншыя.

Наш кар.

Аднатомнік Ф. Багушэвіча на рускай мове

Дзяржаўнае літаратурнае выдавецтва падрыхтавала да друку аднатомнік выбраных твораў Ф. Багушэвіча на рускай мове. Кніга складаецца з двух раздзелаў. У першым змешчаны вершы з кнігі паэта «Дудка беларуская», у другім—творы са зборніка «Смык беларускі».

Пераклад з беларускай мовы зрабілі М. Галодны, П. Сямынін, Б. Ірынін, Карабан і Цвялёў.

Кніга выдаецца дзесяцітысячным тыражом і выйдзе ў свет у верасні.

Самадзейнасць Кіраўскага Дома культуры

Пры Кіраўскім раённым Доме культуры, Бабруйскай вобласці, рэгулярна працуюць драматычны, харавы, струнны і танцавальны гурткі.

Для ўдзельнікаў мастацкай самадзейнасці метадыстыя абласнога Дома народнай творчасці прачыталі 6 лекцый на творчыя тэмы, сярод якіх: «Работа над роляй», «Мова на сцэне», «Работа струннага самадзейнага аркестра» і інш.

Сіламі гурткоў мастацкай самадзейнасці за 7 месяцаў гэтага года было пастаўлена 50 спяктакляў. На іх прысутнічала звыш 10.000 чалавек. У рэпертуары — песні аб Сталіне, беларускія народныя песні, народныя танцы «Лявоніха», «Крыжачок», сцэны з камедыі Гогаля «Рэвізор», з п'ес Астроўскага «Прыбытковае месца» і «Без віны вінаватыя».

Гурткі сістэматычна выязджаюць у калгасы раёна.

Я. ЯВІЧ

УСТАНОВА, ДЗЕ ПАНУЕ БЕЗАДКАЗНАСЦЬ

У Мінску ёсць вышэйшая музычная навучальная ўстанова — Беларуская Дзяржаўная кансерваторыя. На кансерваторыю ўскладзена пачэсная задача забеспячэння музычных тэатраў і навучальных устаноў, канцэртных арганізацый і Дамоў народнай творчасці высокакваліфікаванымі спевакамі, хормайстрамі, інструменталістамі, гісторыкамі і тэарэтыкамі музыкі.

Вынікі экзаменацыйнай сесіі ў кансерваторыі вельмі пераканаўча падкрэслілі, што гэтая музычная ВНУ не выконвае тых патрабаванняў, якія да яе прад'яўляюцца. Найбольш сумныя вынікі паказалі дзяржаўныя экзамены студэнтаў, якія закончылі кансерваторыю. З сямі выпускнікоў толькі тры студэнты фартап'яннага факультэта і адзін аркестровага здалі дзяржаўныя экзамены. Што-ж да астатніх, дык два студэнты дзяржаўных экзаменаў не здалі, а адзін нават не з'явіўся на экзамены.

Правал на дзяржаўных экзаменах — вынік бяздзейнасці і безадказнасці кіраўніцтва кансерваторыі. Да апошняга часу ў кансерваторыі няма кафедры гісторыі музыкі. Загадчык аб'яднанай гісторыка-тэарэтычнай кафедры тав. Ліцецкі з'яўляецца ў кансерваторыю ад выпадку да выпадку. Не дзіўна, што дыпломная работа студэнткі-гісторыка нават не праглядалася на кафедры і не прынята дзяржаўнай экзаменацыйнай камісіяй з прычыны грубых ідэйных памылак.

Такі-ж правал і студэнткі, якая закончыла кансерваторыю па дырыжорска-харавой спецыяльнасці. Калі кожны студэнт-інструменталіст або вакаліст яшчэ мае магчымасць займацца, дык дырыжор-харавік патрабуе наяўнасці хора, дырыжыруючы якім ён можа набыць патрэбныя навыкі. У кансерваторыі хора няма, хоць усе магчымасці для арганізацыі яго са складу саміх-жа студэнтаў усіх спецыяльнасцей ёсць. Карысць ад такога хора была-б не толькі для студэнтаў дырыжораў-харавікоў, але і для ўсіх астатніх удзельнікаў хора, таму што харавое спяванне пашырыла-б іх музычную культуру.

Становішча са здачай экзаменаў на малодшых курсах таксама не лепшае. Даволі сказаць, што ў студэнтаў кансерваторыі 20 процантаў дысцыплін вучэбнага плана не атэставана з-за няяўкі на экзамены, альбо нездавальняючых ацэнак. Да гэтага трэба яшчэ дадаць, што 14 студэнтаў пакінута на другі год, 8 звольнена з прычыны поўнай непаспяховасці і 23 студэнты пераведзены на наступныя курсы ўмоўна, г. зн. у тым выпадку, калі яны здадуць восенню ўсе залікі і экзамены, прадугледжаныя планам. У выніку атрымоўваецца, што з 125 чалавек студэнтаў першых чатырох курсаў кансерваторыі 45 не выканала вучэбнага плана; іншымі словамі—36 процантаў усяго складу студэнтаў! А калі да ўсяго дадаць, што на працягу 1947—48 навучальнага года з кансерваторыі «адсеялася» з прычыны, галоўным чынам, непаспяховасці, акрамя названых 8, яшчэ 34 студэнты, дык дзейнасць кансерваторыі выглядае вельмі і вельмі сумна. Адна трэцяя ўсіх «праваленых» экзаменаў прыпадае на музычна - тэарэтычныя дысцыпліны, г. зн. на той цыкл, якім павінна кіраваць гісторыка-тэарэтычная кафедра.

Калі-б у кансерваторыі была пасапраўднаму арганізавана і працавала вакальная кафедра, то экзамен па оперных урыўках не даў-бы такіх вынікаў, што самі педагогі-вакалісты былі вымушаны прызнаць праведзены паказ па якасці горшым, чым звычайная самадзейнасць.

Кафедры, становішча на якіх больш-менш лепшае (фартап'янная, струнная, духавая) таксама далёка не выканалі тых патрабаванняў, якія да іх прад'яўляліся. Калі ў 1947—48 годзе кафедры дамагліся таго, што на справаздачных студэнцкіх канцэртах выступілі ўсе студэнты выканаўчых спецыяльнасцей (зноў-такі акрамя дырыжораў-харавікоў), то самі педагогі, хоць гэта і ўваходзіць у іх абавязкі, акрамя прафесара Амітона і дацэнта Сяданкінай, не далі ніводнага канцэрта. Тое самае можна сказаць і аб метадычнай і навукова-даследчай рабоце кафедр. З вялікага плана навуковай работы кафедр выкананы толькі дзве работы: падручнік па тэорыі музыкі дацэнта В. Яфімава (гісторыка-тэарэтычная кафедра) і «Школа ігры на цымбалах» дацэнта І. Жыновіча.

Ніякага апраўдання няма для таго факту, што студэнты кансерваторыі, акрамя тых, хто працуе, нідзе не праходзяць педагагічнай і вытворчай практыкі. Вынікі вельмі не суцяшальныя—студэнты-піяністы ў большасці выпадкаў не ўмеюць акампаніраваць, хормайстры—правільна паказаць уступ і дыханне і г. д.

Мы зрабілі некаторыя, далёка невычарпальныя, заўвагі аб выніках 1947—48 навучальнага года ў Беларускай Дзяржаўнай кансерваторыі. Але ўжо і гэтыя заўвагі прымушаюць звярнуць увагу на сур'ёзнасць становішча з арганізацыяй вучэбнага працэса ў кансерваторыі.

Безумоўна, кансерваторыя патрабуе вялікай дапамогі. Ёй патрэбен рад высокакваліфікаваных педагогаў. Кансерваторыі неабходна ўрэшце пасля чатырохгадовай цыганіны вярнуць інтэрнат па Басіялаўскай вуліцы, што належаў ёй, але заселены цяпер людзьмі, якія не маюць да кансерваторыі ніякіх адносін. Але ўсё гэта не здымае з дырэкцыі кансерваторыі і ўсяго яе педагагічнага каляктыва адказнасці за бяздзейнасць.

Галоўны рэдактар М. ГОРЦАЎ.
Рэдкалегія: М. БЛІСЦІНАЎ, В. ВІТКА (КРЫСЬКО)—нам. галоўнага рэдактара, М. КАЦАР, П. ПАДКАВЫРАЎ, П. ПАНЧАНКА, М. ПАСЛЯДОВІЧ, Я. РАМАНОВІЧ, К. САННІКАЎ.

ПРАЦЯГВАЕЦЦА ПАДПІСКА
на газету
„ЛІТАРАТУРА і МАСТАЦТВА“
на кастрычнік, лістапад і снежань 1948 года
Падпісная цана:
на 1 месяц — 2 руб. 20 кап.,
да канца года — 6 руб. 60 кап.
Падпіска прымаецца ва ўсіх гарадскіх і раённых аддзяленнях „Саюздруку“, а ў сельскай мясцовасці—на пошце.

АТ 02316 Адрас рэдакцыі: Мінск, Рэвалюцыйная, 3 Друкарня «Чырвоны Друкар», Рэвалюцыйная, 12.